

Сёлета спаўняецца 590 гадоў, як у Новагародку браў свой чацвёрты шлюб 70-гадовы кароль польскі і найвышэйшы князь літоўскі Ягайла з 17-гадовай князёўнай Соф'яй Гальшанскай. СТАР. 3



У краіне пачаў функцыянаваць Следчы камітэт. Як дзейнічае новая структура ў паўночнай вобласці, расказаў начальнік упраўлення СК Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці, падпалкоўнік юстыцыі Уладзімір Шалухін. СТАР. 5



Ірландская культура набыла вядомасць ва ўсім свеце. У нашай краіне таксама ёсць прадаўжальнікі «зялёных» традыцый. З'яўляюцца школы ірландскіх танцаў, музычныя гурты, якія выконваюць ірландскі фолк. СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЧЭРВЕНЯ 2012 г. СЕРАДА № 111 (27226) Кошт 1200 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «АМНІСТЫЯ — ГЭТА ПРАЯЎЛЕННЕ ГУМАНІЗМУ З БОКУ ДЗЯРЖАВЫ ДА АСОБ, ЯКІЯ ЗРАБІЛІ ПАМЫЛКУ Ў ЖЫЦЦІ»

**Амністыя — гэта рэальнае праяўленне гуманізму з боку дзяржавы да асоб, якія зрабілі памылку ў жыцці, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 12 чэрвеня на нарадзе па пытанню амністыі некаторых катэгорый асоб, якія ўчынілі злачынствы.**

Удзел у нарадзе прынялі кіраўнікі сілавых ведамстваў краіны, вышэйшыя службовыя асобы, у кампетэнцыі якіх знаходзяцца разгледжаныя пытанні. Прэзідэнт падкрэсліў, што «амністыя заўсёды з'яўляецца важным мерапрыемствам у грамадстве, і многія людзі, у першую чаргу сем'і тых, хто знаходзіцца ў адпаведных месцах, з надзеяй чакаюць гэтага заканадаўчага акта». Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што амністыя ў гэтым годзе будзе прымеркавана да Дня Незалежнасці Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што, выступаючы ў маі з Пасланнем беларускаму народу і парламенту, прасіў, каб праект закона аб амністыі быў падрыхтаваны аператыўна. Гэта — дванаццаты па ліку закон аб амністыі, які будзе прыняты ў Беларусі з 1991 года. Апошняя амністыя прайшла ў 2010 годзе і была прымеркавана да 65-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Тады на свабоду з папраўчых установ закрытага тыпу выйшлі амаль 2,5 тыс. чалавек, для 8,5 тыс. асуджаных быў скарочаны тэрмін адбывання пакарання.

«Некаторыя лічаць, што такія акты прымаюцца вельмі часта. Іншыя выступаюць у прынцыпе супраць амністыі зняволеных, асцерагаючыся рэцыдыўнай злачыннасці, а некаторыя, якіх гэта вельмі датычыцца, падтрымліваюць такія меры з боку дзяржавы», — адзначыў Прэзідэнт. Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што амністыя — гэта тая мера, якая дасць магчымасць грамадзянам, якія зрабілі памылку ў жыцці, стаць на шлях выпраўлення і адаптавацца да сацыяльнага асяроддзя.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што галоўная задача на нарадзе — яшчэ раз усё ўзважыць і канчаткова вызначыць катэгорыі асоб, якія падпадуць пад амністыю ў гэтым годзе. Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што пры падрыхтоўцы законапраекта аб амністыі ён патрабаваў «вельмі аб'ектыўнага, справядлівага падыходу, пазбаўленага ўсялякіх прыватных амбіцый і пратэкцыянізму».

«Усё павінна быць сумленна. Для гэтага трэба выпрацаваць крытэрыі. Згодна з гэтымі крытэрыямі мы і павінны вызначыць, хто трапіць пад амністыю, выйдзе на свабоду, або для каго тэрмін адбывання пакарання будзе скарочаны. І «нацягваць» туды насуперак гэтым крытэрыям, у тым ліку і па нейкіх палітычных матывах, людзей, якія не павінны выходзіць, ні ў якім выпадку нельга», — лічыць Прэзідэнт. Гаворачы аб крытэрыях вызначэння асоб, якія падпадаюць пад амністыю, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што размова ідзе найперш аб людзях, якія не ўяўляюць небяспекі для грамадства і дзяржавы. «Такое часта бывае, калі чалавек зрабіў памылку ў жыцці, але, трапіўшы ў калонію, усвядоміў тое, што ён зрабіў, і цвёрда стаў на шлях выпраўлення. Гэта асабліва датычыцца грамадзян, якія дапусцілі першы раз правапарушэнні і займаліся гаспадарчай дзейнасцю. Яны, відаць, не закаранелыя злачынцы і пры ўмове адбыцця часткі пакарання і пагашэння нанесенага ўрону могуць быць амнісціраваны», — выказаў меркаванне кіраўнік дзяржавы.

«У той жа час нам не трэба, каб чарговая амністыя прывяла толькі да фармальнай разгрузкі месцаў зняволення і тым больш да выхаду на свабоду асоб, схільных да рэцыдываў. Такія людзі павінны адбываць пакаранні там», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Такой жа катэгарычнай павінна быць пазіцыя адносна тых, хто не пагасіў нанесены ўрон і парушае парадак адбывання пакарання або наогул знаходзіцца ў вышуку. Як яшчэ раз падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, «ніякай палітыкі пры правядзенні амністыі быць не павінна». Кіраўнік дзяржавы сказаў: «Мы праводзім амністыю ў нашай дзяржаве і для нашага грамадства. Гэта і сігнал грамадству, і заахвочванне зняволеных. Ніякай палітыкі тут быць не павінна».

На нарадзе міністр унутраных спраў Ігар Шуневіч далажыў аб асаблівасцях законапраекта аб амністыі і назваў катэгорыі грамадзян, якія будуць падпадаць пад дзеянне гэтага нарматыўнага акта. На думку міністра, амністыя ні ў якім выпадку не акажа негатыўнага ўплыву на крымінагенную сітуацыю ў краіне. Як заўважыў кіраўнік дзяржавы, у цэлым колькасць вызваленых па амністыі складзе каля 10 працэнтаў ад агульнай колькасці зняволеных у краіне, і нагадаў, што ў пачатку яго прэзідэнцтва ў месцах пазбаўлення волі знаходзіліся амаль удвая больш грамадзян, чым сёння.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў асаблівую ўвагу на такі важны аспект, як амністыя адносна асуджаных за эканамічныя злачынствы: абавязковай умовай тут павінна з'яўляцца пагашэнне нанесенага ўрону. Прэзідэнт таксама зрабіў акцэнт на неабходнасць максімальна гуманнага падыходу пры разглядзе пытанняў аб вызваленні цяжарных і жанчын, якія маюць дзяцей, а таксама непаўналетніх. Удзельнікі нарады выказалі свае меркаванні адносна падрыхтаванага законапраекта. У цэлым яны падтрымалі неабходнасць такога кроку і адобрылі выпрацаваныя крытэрыі вызначэння асоб, якія падпадаюць пад амністыю.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

■ Жыццялюбы

# ПАСЛЯ 70 УСЁ ТОЛЬКІ ПАЧЫНАЕЦЦА!



Фота Надзеі ДРЫЛЫ.

Майстар-самавучка ля свайго цуда-дамка на беразе Дняпра.

### У гэтым ні кроплі не сумняваецца рэкардсмен па колькасці хобі са Жлобіна

**У свае 76 Генадзь Герасімавіч Пархоменка — падцягнуты і энергічны. І не дзіўна: — кожны свой дзень ён пачынае з аўсянкі з дзьмухаўцамі і партыі ў настольны тэніс. А пасля садзіцца на веласіпед і намотвае дзясяткі кіламетраў па горадзе, пакуль не вырашыць усе запланаваныя справы. А іх у мясцовай славутасці, паверце, хоць гаць гаці.**

### «БЕЗ УСМЕШКІ НЕ ЗАХОДЗІЦЬ!»

Будзеце ў Жлобіне — абавязкова завітайце на вуліцу Карпілаўскую! Менавіта там, на ўскраіне горада, знаходзіцца цуда-дамок, зроблены на пацеху ўнукам і на радасць людзям «залатымі» рукамі майстра-самавучкі Пархоменкі. Не заўважыць яго — у карунках з пластыку і металу, з рознакаляровымі флюгерамі і фігуркамі казачных герояў — проста немагчыма. СТАР. 4

ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір ЗДАНОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе:**

*Часта здараецца так, што абітурыент, які атрымаў мэтавае накіраванне, здае цэнтралізаванае тэсціраванне на больш высокія балы, чым ён чакаў, і проста выкідвае накіраванне ў смецніцу. А прадпрыемства ж спадзяецца на тое, што гэты малады чалавек прыйдзе на працу. Для выключэння такіх сітуацый трэба рэгуляваць гэтае пытанне на заканадаўчым узроўні, каб абітурыенты, якія атрымалі мэтавае накіраванне, не мелі права ад яго адмовіцца».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.06.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8240,00 | ▼ |
| Еўра | 10310,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 251,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1017,41 | ▼ |

## ВУП БЕЛАРУСІ Ў СТУДЗЕНІ—МАІ ЎЗРОС НА 3,1 ПРАЦЭНТА

**Валавы ўнутраны прадукт Беларусі ў студзені—маі 2012 года дасягнуў Br187,4 трлн, што на 3,1 працэнта больш у параўнанні з аналагічным перыядам 2011 года пры гадавым прагнозе росту на 5-5,5 працэнта. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Нацыянальным статыстычным камітэце Беларусі.**

Выпуск прамысловай прадукцыі за пяць месяцаў бягучага года павялічыўся на 7,2 працэнта і склаў Br265 трлн (гадавы прагноз росту — на 6-7 працэнтаў). Удзельная вага адгружанай інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме адгружанай прадукцыі склала 17,6 працэнта пры гадавым прагнозе 13,5-14,5 працэнта.

Рост аб'ёму вытворчасці сельгаспрадукцыі ў гаспадарках усіх катэгорый у студзені—маі бягучага года склаў 106,1 працэнта (прагноз на год 104-105 працэнтаў), выраблена прадукцыі на Br25,4 трлн. Пры гэтым у арганізацыях, якія ажыццяўляюць сельскагаспадарчую дзейнасць, вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі павялічылася на 8,3 працэнта да Br23,4 трлн.

Інвестыцыі ў асноўны капітал у студзені—маі бягучага года склалі Br44,8 трлн, або 79 працэнтаў да адпаведнага перыяду мінулага года. За кошт усіх крыніц фінансавання ўведзена ў эксплуатацыю 1 млн 674,7 тыс. кв.м жылля, што на 2,2 працэнта ніжэй за аналагічны перыяд мінулага года.

## КОЛЬКАСЦЬ ВАКАНСІЙ У 2,2 РАЗА ПЕРАВЫШАЕ КОЛЬКАСЦЬ БЕСПРАЦОЎНЫХ, А Ў МІНСКУ — У 8,1 РАЗА

**У Беларусі на 1 чэрвеня бягучага года вакансій было ў 2,2 раза больш, чым беспрацоўных. Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ва ўпраўленні палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.**

У гэтым годзе колькасць свабодных рабочых месцаў паступова расце, асабліва гэты працэс актывізаваўся з надыходам вясны. Менавіта ў вясенне-летні перыяд традыцыйна адзначаецца ажыўленне попыту на рабочую сілу, падкрэслілі ў міністэрстве. СТАР. 2

## Змяняецца плата за асобныя адміністрацыйныя працэдуры

**Такое рашэнне прадугледжана ўказам №197, якім былі ўнесены змяненні і дапаўненні ў пералік адміністрацыйных працэдур, што ажыццяўляюцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі па заявах грамадзян, ад 12 красавіка 2012 года, паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве юстыцыі.**

У прыватнасці, за выдачу паўторнага пасведчання аб рэгістрацыі акта грамадзянскага стану памер платы складзе 0,5 базавай велічыні, цяпер яна складае адну базавую велічыню. За прастаўленне апостыля на афіцыйным дакуменце, складзеным на тэрыторыі Беларусі, памер платы таксама зменшыцца з адной да 0,5 базавай велічыні.

За прадастаўленне інфармацыі з Адзінага дзяржаўнага рэгістра юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў памер платы павялічыцца да адной базавай велічыні за прадастаўленне інфармацыі па кожнай юрыдычнай асобе, індывідуальнаму прадпрымальніку (цяпер 0,1 базавай велічыні).

Акрамя таго, указам прадоўжаны да аднаго года тэрмін дзеяння даведак, якія змяшчаюць звесткі з запісаў актаў грамадзянскага стану і паведамленняў аб адсутнасці запісу акта грамадзянскага стану (цяпер 6 месяцаў).

Змяненні ўступаюць у сілу з 9 жніўня 2012 года.

## РАЗБІЎСЯ СУ-25

**Учора ў Гродзенскай вобласці пацярпеў катастрофу ваенны самалёт Су-25. Лётчык загінуў.**

У прэс-службе Міністэрства абароны паведамляюць: «12 чэрвеня пры выкананні планавых палётаў у раёне авіяцыйнага палігона адбылося крушэнне самалёта Су-25 116-й штурмавой авіяцыйнай базы. Падчас палёту адпрацоўвалася тэхніка пілатавання і паветранай навігацыі на малых і гранічна малых вышынях. Пасля выканання задання каля 15.35 на вышыні 200 метраў самалёт пачаў страчваць кіраванне. Кіраўніком палёту была дадзена каманда лётчыку на катапультаванне. Лётчык здолеў адвесці машыну ад вёскі Навіны Навагрудскага раёна. Падзенне самалёта адбылося ў двух кіламетрах на поўнач ад названага населенага пункта. Пілот — ваенны лётчык 1-га класа падпалкоўнік Грыднёў Мікалай Генадзьевіч — загінуў. Для высвятлення прычын здарэння прызначана камісія Міністэрства абароны».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**



### КОРАТКА

Паводле аператыўных даных, рэальная заработная плата работнікаў Беларусі (без суб'ектаў малога прадпрымальніцтва недзяржаўнай формы ўласнасці) у красавіку бягучага года склала 101,2% да ўзроўню сакавіка 2012 года, а да ўзроўню красавіка 2011 года — 103,4%.

У Беларусі з 12 чэрвеня мінімальны памер статутнага фонду для навастворанага (рэарганізаванага) банка ў беларускіх рублях павялічаны да сумы, эквівалентнай 25 млн еўра.

Беларуская балерына Кацярына Алейнік удастоена трэцяй прэміі і звання лаўрэата Міжнароднага балетнага конкурсу ў Хельсінкі (Фінляндыя). Міжнародны балетны конкурс, сёмы па ліку, праводзіўся ў Фінскай нацыянальнай оперы ў рамках юбілейных мерапрыемстваў, прысвечаных святкаванню 200-годдзя Хельсінкі як сталіцы Фінляндыі. У гэтым годзе ў ім прымалі ўдзел сто танцоўшчыкаў больш як з 20 краін свету.

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## ЕЎРАКАМІСІЯ ЎХВАЛІЛА ПРАЕКТ БУДАЎНІЦТВА АЭС У ЛІТВЕ

Еўракамісія прадставіла станоўчыя высновы адносна будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Вісагінасе. Пра гэта заявіў еўракамісар Альгірдас Шэмета. Меркаванне ЕК дазволіць Вільнюсу заняць сродкі на АЭС пад больш нізкія працэнты. Будаўніцтва ВАЭС абыдзецца ў 6 мільярдаў долараў (каля 17 мільярдаў літаў). Крэдыты, як чакаецца, дадуць еўрапейскія, амерыканскія і японскія банкі.

## ЧАВЕС ЗАРЭГІСТРАВАЎСЯ КАНДЫДАТАМ У ПРЭЗІДЭНТЫ І СТАНЦАВАЎ ПЕРАД ПРЫХІЛЬНІКАМІ



Дзейны прэзідэнт Венесуэлы Уга Чавес зарэгістраваўся кандыдатам на выбарах кіраўніка дзяржавы. Пра гэта паведамляе BBC News. Уга Чавес з'яўляецца прэзідэнтам Венесуэлы з 1999 года. 57-гадовы палітык збіраецца пазмагацца за прэзідэнцкую пасаду на выбарах, прызначаных на 7 кастрычніка 2012 года. У дзень рэгістрацыі Чавеса кандыдатам у прэзідэнты на вуліцы Каракаса выйшлі тысячы прыхільнікаў кіраўніка дзяржавы. Чавес не толькі звярнуўся да іх з прамовай, але і выканаў перад прыхільнікамі народную песню і станцаваў. У апошні час Чавес рэдка з'яўляўся на публіцы ў сувязі з праходжаннем лячэння ад раку і наступнай рэабілітацыяй. У прамове перад прыхільнікамі Чавес падкрэсліў, што жыхары яго краіны сталі ахвярамі «псіхалагічнай вайны», адным з элементаў якой былі паведамленні аб яго смерці. Дзейны кіраўнік Венесуэлы выказаў намер змагацца з усіх сіл і перамагчы на выбарах.

## ПАМЕР НОБЕЛЕЎСКАЙ ПРЭМІІ ЗМЕНШЫЎСЯ НА 20 ПРАЦЭНТАЎ



Памер Нобелеўскай прэміі зменшыўся да 1,1 млн долараў. Такое рашэнне прынята на нарадзе савета дырэктараў Нобелеўскага фонду. На думку кіраўніцтва фонду, гэтая мера дапаможа пазбегнуць скарачэння капіталу арганізацыі ў доўгатэрміновай перспектыве.

Як гаворыцца ў заяве фонду, кіраванне капіталам «павінна ажыццяўляцца такім чынам, каб прэмію можна было ўручаць бясконца». «Нобелеўскі фонд нясе адказнасць за тое, каб памер прэміі мог заставацца на высокім узроўні працяглы час», — адзначыў выканаўчы дырэктар фонду Ларс Хайкенстэн. У апошнія гады даходаў, што атрымліваюцца ад выкарыстання капіталу, не хапала нават на выплату грашовага складніка прэміі, пакрыццё выдаткаў на цырымонію ўручэння, а таксама на ўтрыманне адміністрацыйнага апарату.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## БЯЛКОВАЯ ДЫЕТА ПРЫЗНАНА БЯСПЕЧНАЙ ДЛЯ НЫРАК

Доўгі час дыетолагі сумняваліся адносна бяспекі нізкавугляводнага рацыёну. Лічылася, высокая канцэнтрацыя бялкоў можа нашкодзіць ныркам. Аднак апошняе даследаванне Медыцынскай школы Універсітэта Індыяны даказала: дыета бяспечная. Навукоўцы спецыяльна параўналі эфект бялковай дыеты і стандартнай дыеты з нізкім утрыманнем тлушчу на прыкладзе 307 поўных добраахвотнікаў без прыкмет хвароб нырак або любых іншых хранічных хвароб. Па сканчэнні двух гадоў аказалася, што першая дыета не пашкодзіла ныркам, канстатуе доктар Элан Фрыдман. Вядома: бялок у крыві звязаны з мноствам пазітыўных аспектаў, уключаючы барацьбу з інфекцыямі, палепшаную цыркуляцыю крыві.

Даследчыкі высветлілі, што для здаровых людзей з лішняй вагой усё роўна, якім чынам худнець. Зніжэнне вагі ў любым выпадку стварае пазітыўны эфект, а бялковая дыета не нашкодзіць.

## ЦІ ПАДЗЯЛЯЕЦЕ ВЫ ДУМКУ, ШТО АТРЫМАННЕ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ — АБАВЯЗКОВАЯ ЎМОВА ДАСЯГНЕННЯ ПОСПЕХУ Ў ЖЫЦЦІ?



**Сяргей МАСКЕВІЧ, міністр адукацыі:**

— Самае галоўнае, каб маладыя людзі ставілі перад сабой сваю мэту, а не мэту сваіх бацькоў. У мяне ўсё часцей напрошваецца аналогія з 60-70-і гадамі XX стагоддзя. Большасць беларусаў у тыя часы жылі не ў гарадах, а ў сельскай мясцовасці. Сялянская праца заўсёды была цяжкай, таму бацькі казалі сваім дзецям: «Добра вучыся, едзь у горад, паступай у інстытут, каб жыць лепш за нас». А што мы назіраем сёння? Бацькі лічаць сваім святым абавязкам даць дзіцяці вышэйшую адукацыю, але ж іх жаданне не павінна ператварацца ў самамэту. Адукацыя якой цаной? Якімі намаганнямі? Я ведаю шмат людзей, вельмі творчых, крэатыўных, якія не ідуць атрымліваць вышэйшую адукацыю, бо разумеюць, што не маюць здольнасцяў да навук. Заканчэнне ВНУ — зусім не гарантыя дасягнення поспеху ў жыцці. Каб пасля заканчэння ВНУ маладых людзей не спасцігла расчараванне, ім трэба загадзя ведаць, што за дыпломам павінны абавязкова стаяць веды, уменні, гіганцкая працавітасць і здольнасць рэалізаваць сябе. Калі ты будзеш штучным спецыялістам — хоць сантэхнікам, хоць маляром — то заўсёды будзеш паважаным чалавекам у грамадстве. І я асабіста не бачу нічога ганебнага ў тым, што людзі пасля ВНУ атрымліваюць яшчэ і рабочую спецыяльнасць і рэалізоўваюць сябе зусім у іншай якасці.



**Віктар ШНІП, галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура»:**

— Я ўпэўнены, што для таго, каб быць культурным і высокаадукаваным чалавекам, недастаткова проста мець дыплом ВНУ. Тым больш што на лбе ў чалавека не напісана, ці ёсць у яго вышэйшая адукацыя. Вельмі шмат залежыць непасрэдна ад чалавека. Сёння для самаадукацыі ёсць такія шырокія магчымасці, якія майму пакаленню нават не сніліся. Дзякуючы інтэрнэту можна зайсці ў любую бібліятэку свету, знайсці любую кнігу, наведаць славутыя мастацкія галерэі. А вышэйшую адукацыю трэба атрымліваць, ужо маючы пэўны жыццёвы досвед. У гэтым выпадку і выбар прафесіі будзе больш свядомы. Рабочыя рукі заўсёды будуць запатрабаваны, чаго не скажаш пра выпускнікоў многіх спецыяльнасцяў ВНУ. Я ведаю дастаткова людзей, якія атрымлівалі адну прафесію, але займаюцца ў жыцці зусім іншай справай. Вядома, калі чалавек плануе бачыць сябе кіраўніком, то без вышэйшай адукацыі яму не абысціся. Але вышэйшую адукацыю можна атрымліваць і завочна.



**Дзмітрый ШАЎЦОЎ, старшыня Беларускай асацыяцыі ўрачоў, галоўны ўрач 34-й мінскай гарадской паліклінікі, дэпутат Мінскага гарадскога савета дэпутатаў:**

— Усё залежыць ад таго, якія мэты ставіць перад сабой чалавек. Калі ў яго здаровыя амбіцыі, ён хоча стаць кіраўніком і заняць пэўную нішу ў грамадстве, то, безумоўна, без вышэйшай адукацыі яму не абысціся. Напрыклад, без вышэйшай адукацыі немагчыма стаць урачом, як, напэўна, і педагогам. Але, шчыра кажучы, і ўрачы, і педагогі бываюць розныя. Аднойчы, калі я яшчэ сам навучаўся ў медінстытуце, стаў сведкам размовы паміж дзюма настаўніцамі малодшых класаў, якія завочна атрымлівалі адукацыю ў Магілёўскім дзяржаўным педагагічным універсітэце. Тыя дзяліліся ўражаннямі ад сесіі, маўляў, ледзь на «тройку» экзамены здалі (у той час дзейнічала яшчэ пяцібальная сістэма). Я быў моцна ўражаны. І чаго нам чакаць ад нашых дзяцей, калі іх навучаюць у школе такія настаўнікі? Прызнаюся, што і сярод маіх аднакурснікаў былі людзі, якія звязалі сваё жыццё з медыцынай або пад прымусам бацькоў, або выпадкова. І ўжо ў студэнцкія гады было зразумела, што яны дапусцілі ў сваім жыцці сур'ёзную памылку. Але з іншага боку, вельмі шкада, калі дзеці медыкаў не ідуць у медыцыну. Мне асабіста б вельмі хацелася, каб мае дзеці пайшлі па нашых слядах: мы з жонкай абое — медыкі. Але прымушаць іх не будзем...

**Падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ЗАСНАВАНЫ ЭМБЛЕМА І СЦЯГ СЛЕДЧАГА КАМІТЭТА БЕЛАРУСІ

Заснаваны геральдычны знак — эмблема і сцяг Следчага камітэта Беларусі. Адпаведны ўказ №262 «Аб мерах па забеспячэнні дзейнасці Следчага камітэта» кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў 11 чэрвеня.

Дакументам заснаваны геральдычны знак — эмблема і сцяг Следчага камітэта, нагрудны знак узнагароды «За заслугі», знакі адрознення па спецыяльных званнях і форма адзення супрацоўнікаў гэтага ведамства.

Таксама зацверджаны палажэнні аб геральдычным знаку — эмблеме, сцягу і нагрудным знаку Следчага камітэта, іх апісанні і відарысы. Акрамя таго, дакументам зацверджаны пералік прадметаў формы адзення супрацоўнікаў Следчага камітэта, апісанне знакаў адрознення па спецыяльных званнях, палажэнне аб парадку матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння Следчага камітэта.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## КОЛЬКАСЦЬ ВАКАНСІЙ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Так, у агульнарэспубліканскім банку вакансій (зыходзячы з заявак наймальнікаў у органы па працы, занятасці і сацабароне) на 1 чэрвеня гэтага года налічвалася амаль 65,6 тыс. свабодных рабочых месцаў (для параўнання: на 1 мая бягучага года іх было звыш 59 тыс., на 1 красавіка — 56,9 тыс., на 1 сакавіка — 54,2 тыс., на 1 лютага — 53 тыс., на 1 студзеня — 51,7 тыс.). Колькасць вакансій за май гэтага года ўзрасла на 6,5 тыс. Паводле прагнозаў спецыялістаў, у бліжэйшы месяц такая тэндэнцыя захаваецца.

Пры гэтым колькасць зарэгістраваных беспрацоўных у рэспубліцы на 1 чэрвеня бягучага года зменшылася да 29,7 тыс. чалавек (год таму было 31,3 тыс.). Як вынік, магчымасць умоўнага працаўладкавання беспрацоўных на вакансіі складае цяпер 220,9 працэнта (год таму гэты паказчык быў 190,4 працэнта). Пры гэтым структура попыту на рабочую сілу істотна не змянілася: рынак працы, як і раней, арыентаваны на рабочыя прафесіі, якія складаюць цяпер 79,9 працэнта ад агульнай колькасці вакансій. Яны арыентаваны ў асноўным на прымяненне мужчынскай працы.

Захоўваецца таксама дысбаланс тэрытарыяльнай структуры вакансій. Напрыклад, у Мінску вакансій у 8,1 раза больш, чым беспрацоўных (на 1 чэрвеня ў сталіцы было звыш 21,8 тыс. свабодных рабочых месцаў, а беспрацоўных зарэгістравана на гэту дату менш за 2,7 тыс. чалавек, узровень зарэгістраванага беспрацоўя знізіўся да 0,2 працэнта да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва сталіцы). Прычым у Мінску адкрыта кожная трэцяя вакансія з агульнарэспубліканскага банка свабодных працоўных месцаў. Паводле аператыўных даных, ва ўсіх рэгіёнах рэспублікі колькасць вакансій істотна перавышае колькасць беспрацоўных.

## АД ЧАГО ЗАЛЕЖЫЦЬ ЛІЗІНГ?

**Летась беларускім лізінгавым кампаніям удалося ўтрымаць рынак ад істотнага падзення і нават паказаць станоўчую дынаміку ў нацыянальнай валюце — такую выснову зрабілі эксперты. Іншымі высновамі наконт беларускага рынку лізінгу з журналістамі падзяліўся Аляксандр ЦЫБУЛЬКА, старшыня рады Асацыяцыі лізінгадаўцаў:**

— Мінулы год быў вельмі цяжкім, што звязана ў першую чаргу з праблемамі на валютным рынку. Гэта наклала свой адбітак на працу лізінгадаўцаў — хто працаваў з аб'ектамі лізінгу, якія закупляліся за межамі, былі абмежаваны ў доступе да валютных сродкаў, а беларускія заводы з-за множнасці курсаў таксама не маглі сфарміраваць рублёвыя цэны і спынілі водпуск прадукцыі за рублі. Таму фактычна вынікі года, якія атрымаліся — гэта толькі паўгадовая праца, бо некалькі месяцаў лізінгадаўцы фактычна не працавалі.

У рублёвым эквіваленце рынак лізінгу за 2011 год вырас на 69%, а калі лічыць у валюце — то ўпаў на 16%. Кошт заключаных за год дагавораў лізінгу склаў 6,88 мільярда рублёў, або 854 мільёны еўра па сярэднеўзважаным курсе.

**Сяргей ШЫМАНОВІЧ, дырэктар Асацыяцыі лізінгадаўцаў,** аб'явіў рэйтынг лізінгавых кампаній па выніках працы ў 2011 годзе. Першае месца з доляй у 34,35% заняла кампанія «ВТБ-Лізінг», другое — «АСБ Лізінг» (19,02%), трэцяе — «Прамагралізінг» (15,25%). Усяго ў 2011 годзе на прафесійнай аснове лізінгавымі аперацыямі займаліся каля 40 кампаній. З іх толькі 28 выказалі гатоўнасць падаць справаздачы для стварэння рэйтынгу лізінгавых кампаній, астатнія адмаўлялі ў асноўным з-за таго, што мелі невялікія аб'ёмы лізінгавых аперацый.

Як расказаў Аляксандр Цыбулька, у мінулым годзе з'явіўся новы аб'ект лізінгу — чыгуначныя вагоны, і яны вельмі істотна паўплывалі на велічыню агульнага аб'ёму новага бізнэсу. У асноўным з чыгуначнымі вагонамі працавалі дзве кампаніі — «ВТБ-лізінг» і «АСБ Лізінг». Дарэчы, калі паглядзець на рынак Расіі, то там лізінг чыгуначных вагонаў займае да 55% рынку. Фактычна, хто займаецца чыгуначнымі вагонамі, той і лідар на рынку Расіі.

У 2011 годзе працягвалася зніжэнне ўзроўню пратэрмінаванай запазычанасці. Калі ў 2009 годзе яна была на ўзроўні 13%, у 2010 — 10%, то ў 2011 — толькі 8%. Прычым, як адзначыў Аляксандр Цыбулька, асноўны ўнёсак у пратэрмінаваную запазычанасць робіць адна кампанія, якая працуе на рынку дзяржпраграм у сельскай гаспадарцы, бо па іншых кампаніях гэты паказчык не перавышае 2%.

Журналісты папрасілі Аляксандра Цыбульку зрабіць прагноз на 2012 год — як сёлета будзе развівацца лізінг. Ён лічыць, што калі не будзе нейкіх катаклізмаў, то можна прагназаваць устойлівы рост.

— Мы вельмі залежная галіна — і ад валютнага рынку, і ад падатковага заканадаўства, і ад нейкіх параметраў фінансавай устойлівасці. Я заўсёды гляджу ў будучыню з аптымізмам, таму мяркую, што рост будзе, але я не бачу прычын для бурнага росту. У той жа Расіі і іншых дзяржавах 75% кліенцкай базы лізінгавых кампаній — гэта малы і сярэдні бізнэс. У нас у краіне гэтая праслойка бізнэсу вельмі слабая, а без росту гэтага сектара лізінгавая галіна таксама будзе абмежаваная ў росце.

Варта адзначыць, што ў 2011 годзе доля лізінгу ў агульным аб'ёме інвестыцый у асноўны капітал вырасла на 0,1 працэнтнага пункта і склала 7,6%, у ВУП доля лізінгу не змянілася ў параўнанні з 2010 годам і засталася на ўзроўні 2,5%. Як кажа Аляксандр Цыбулька, гэта сярэднееўрапейскі ўзровень:

— Як бачыце, база ў нас вельмі добрая, і мы не можам зрабіць вялікі скачок. Дый і не трэба гэтых скачкоў, бо яны потым непазбежна суправаджаюцца спадам.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

### АБЗАЦ




◢ **Камеры фотафіксацыі з 1 ліпеня пачнуць адлоўліваць ліхачоў на трасе Брэст — Мінск — мяжа Расіі (М-1). На трасе ўжо ўсталяваны 15 стацыянарных сістэм фотафіксацыі, якія працуюць пакуль у тэставым рэжыме. У бліжэйшыя і наступныя месяцы ДАІ плануе ўстанавіць на гэтай аўтадарозе яшчэ па 10 такіх сістэм.**

◢ У сувязі з правядзеннем трэніровак роты ганаровай варты 13, 15, 18, 20, 25 і 26 чэрвеня з 22.00 да 24.00 будзе закрыты рух усіх відаў транспарту па праспекце Машэрава на ўчастку ад праспекта Пераможцаў да вуліцы Даўмана. Рота ганаровай варты вядзе падрыхтоўку да святкавання Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

◢ **Новую рэдакцыю Чырвонай кнігі Беларусі плануецца выпусціць да канца 2014 г. Да падрыхтоўкі новага выдання спецыялісты прыступяць у наступным годзе.**

◢ Старажытнае карэйскае мастацтва ігры на барабанах будзе прадстаўлена ў Мінску. 18 чэрвеня ў канцэртнай зале «Мінск» адбудзецца відовішчнае прадстаўленне калектываў «Самульноры» і «Бі-Бой». Яно арганізавана пасольствам Рэспублікі Карэя ў Рэспубліцы Беларусь і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам з нагоды 20-годдзя беларуска-карэйскіх дыпламатычных адносін.

◢ **Нестандартны выпадак адбыўся ў панядзелак вечарам у Мінску, на беразе ракі Свіслач. У мікрараёне Серабранка, недалёка ад вуліцы Малініна, аўтамабіль Peugeot апынуўся ў вадзе. Машына выехала за межы праезнай часткі пры досыць пікантных абставінах. Як расказалі сцецыялісты службы бяспекі дарожнага руху, здарэнне як ДТЗ не афармлялася. Са слоў маладога чалавека, які прадставіўся гаспадаром машыны, ён вырашыў у бязлюдным месцы прыемна пабавіць час з дзяўчынай. Паставіў машыну на ручны тормаз. У нейкі момант выпадкова націснуў на «ручнік», і Peugeot пакаціўся. Пасля падзення ў раку пара выбралася з аўтамабіля, малады чалавек выклікаў эвакуатар. Алкаголю ў крыві выяўлена не было.**

### ПОЎНЫ АБЗАЦ



◢ У Канадзе 17-гадовая выпускніца Кара Коскавіч вырашыла, што няма сэнсу выкідваць шалёныя грошы за ўбор для выпускнога вечара, які давядзецца надзець толькі адзін раз. Пры гэтым не факт, што ў шыкоўным убранні выпускніца будзе арыгінальнай і цікавай. Дзяўчына вырашыла не бегаць па крамах, а накіраваць намаганні на тое, каб прыдумаць арыгінальную сукенку для выпускнога балю. Так нарадзілася крэатыўная ідэя — адзець сукенку... са школьных сшыткаў. На выраб арыгінальнага ўбору пайшло 3 месяцы. Для гэтага ёй спатрэбілася 75 лістоў са старых сшыткаў. Затым яна дадала прыгожы яркі пояс — з вокладак. У стварэнні незвычайнага адзення ёй дапамагла сяброўка, якая прыйшла на выпускны ў сукенцы... з гаспадарчых сумак. Дзяўчаты ў сваіх строях, якія не каштавалі ім ні цэнта, былі самымі папулярнымі на выпускным балі.

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### З БРЭСТА Ў МАГІЛЁЎ — ПА ВАДЗЕ

Турыстычны цеплаход, які будуецца ў Пінску, хутка накіруецца ў порт прыпіскі — Магілёў. Гэта ўжо пятае судна такога кшталту, узведзенае на Пінскім судабудаўніча-сударамонтным заводзе.

Але калі папярэднікі дастаўляліся да месца прызначэння аўтамабільным транспартам, дык на гэты раз судна пойдзе сваім ходам па Прыпяці, праз Кіеўскае вадасховішча, затым увойдзе ў Днепр. Праўда, на шляху цеплаходу давядзецца два разы перасячы беларуска-ўкраінскую мяжу. Цеплаход разлічаны на 80 пасажыраў. Верхняя яго палуба зроблена па прынцыпе кавярні з барнай стойкай, тэлевізарам, іншымі выгодамі. Палубы аснашчаны сістэмай кандыцыянераў. Судна прызначана для эксплуатацыі на рэках і азёрах.

**Яна СВЕТАВА.**

### МАЛЮЮЦЬ... ГРОШЫ

У Магілёўскай вобласці сёлета выяўляюць больш фальшывых грошай. Ад пачатку года зафіксавана 57 спроб збыту фальшывых купюр, а гэта на 20% болей, чым год таму. Трымальнікі фальшывак звычайна выдаюць сябе за пацярпелых: многія запэўніваюць, што атрымалі такія грошы ў Расійскай Федэрацыі, дзе падпрацоўваюць. Аднак ёсць і мясцовыя ўмельцы. Напрыклад, міліцыя затрымала жыхара Глуска, які нідзе афіцыйна не працаваў, але дома старанна рабіў на капіравальнай тэхніцы купюры ў 50 тысяч беларускіх рублёў.

**Алена КАЗЛОВА.**

### ЮНАЯ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦА ЗАСНАВАЛА ФІНАНСАВУЮ ПІРАМІДУ

Супрацоўнікі Ленінскага РУУС Мінска затрымалі 19-гадовую мінчанку, якая спрабавала стварыць фінансавую піраміду.

У верасні 2011-га года дзяўчына аформілася ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка і размясціла аб'яву ў інтэрнэце аб аказанні паслуг па продажы будаўнічых блокаў. Паколькі цана на будматэрыялы была значна ніжэйшая, чым у канкурэнтаў, кліенты знайшліся хутка. Узяўшы з першых заказчыкаў грошы па перадаплаце, зламысніца ў наступных аб'явах павышала цану за тавар і з новых кліентаў брала грошы ўжо па павышанай цане. Яна вяртала першым кліентам іх суму, а рэшту пакідала сабе. Неўзабаве дзяўчына прыняла да сябе на працу яшчэ дваіх чалавек. Аднак вясной недахоп заказчыкаў прывёў да таго, што прадпрымальніца не змагла вярнуць грошы апошнім кліентам. Менавіта яны і звярнуліся ў міліцыю з заявай. У дачыненні да дзяўчыны заведзена крымінальная справа за махлярства.

**Кар. БЕЛТА.**

### ЛЕГКАВУШКА СУТЫКНУЛАСЯ З ГРУЗАВІКОМ

На трасе Верхнядзвінск—Полацк у Верхнядзвінскім раёне трагедыяй скончылася сутыкненне машын «Фальксваген» і «ЗІЛ». Паводле інфармацыі ДАІ, каля дзвюх гадзін дня 34-гадовы жыхар Полацкага раёна, кіруючы аўтамашынай «Фальксваген—Гольф», выехаў на паласу сустрэчнага руху, дзе аўто сутыкнулася з аўтамашынай «ЗІЛ». У выніку гэтага ДТЗ вадзіцель легкавушкі і пасажырка, грамадзянка Расіі, загінулі, а яшчэ адзін пасажыр быў шпіталізаваны.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

### ЛЕПШ БЫ ЗАСТАВАЎСЯ ГАЛОДНЫМ

Пенсіянер з Пінска ледзь не загінуў ад... каструлі. 73-гадовы чалавек паставіў на пліту посуд з адпаведнымі інгрэдыентамі, каб прыгатаваць абед. Што было далей, высвятляецца. Але калі з вокнаў паваліў дым, суседзі выклікалі МНС. Выратавальнікі выцягнулі гаспадара кватэры на свежае паветра. Ён атруціўся прадуктамі гарэння і трапіў на бальнічны ложак.

**Яна СВЕТАВА.**

## Выкрадальнікаў кароў будуць судзіць

**Справа выкрадальнікаў кароў з фермаў у Віцебскай і Мінскай абласцях накіравана ў суд, паведаміў пракурор аддзела пракуратуры Віцебскай вобласці Андрэй Бандажэцкі.**

Як было ўстаноўлена следствам, трое жыхароў Віцебскай вобласці з чэрвеня па снежань 2011 года займаліся крадзяжом буйной рагатай жывёлы ў Лепельскім, Бешанковіцкім, Сенненскім, Аршанскім раёнах Віцебскай вобласці і Крупскім раёне Мінскай вобласці. Ім інкрымінуецца 13 злачынных эпізодаў з крадзяжом 34 кароў на агульную суму Br48,2 млн. Схема дзеянняў злачынцаў была простая: позна ўвечары яны пад'язджалі да фермы, пакуль адзін з зламыснікаў сачыў за вартаўніком, двое іншых выводзілі або выносілі, у залежнасці ад вагі, бычкоў і цёлачак. Жывёла адразу перавозілася і прадавалася скупшчыку.

Такому масаваму крадзяжу садзейнічаў шэраг фактараў: крадзяжы ўчыняліся з дрэнна або наогул неасветленых фермаў, якія да таго ж практычна не зачыняліся. Ахова на іх ажыццяўлялася толькі адным вартаўніком, нягледзячы на значныя тэрыторыі. Да таго ж і самі вартаўнікі часта не былі прыкладам добрасумленных работнікаў — яны проста спалі на працоўным месцы.

Пракуратура таксама звярнула ўвагу, што большасць крадзяжоў учынялася з фермаў у Лепельскім раёне, што можа сведчыць пра слабую прафілактычную працу мясцовых органаў унутраных спраў.

**БЕЛТА.**

## АД ПАДАТКАВІКОЎ НЕ СХАВАЕШСЯ

**Гродзенскія падаткавікі спынілі дзейнасць арганізацыі, якая функцыянавала па прынцыпе псеўдапрадпрымальніцкай структуры, паведамілі ў прэс-цэнтры інспекцыі МПЗ па Гродзенскай вобласці.**

У час праверкі таварыства з абмежаванай адказнасцю ў Гродне ўстаноўлена, што яго службовыя асобы праводзілі незаконныя здзелкі з прадпрымальнікамі і фізасобамі для абнаяўлення грошай і далейшага выкарыстання іх у ценявым абарачэнні.

Гэта гродзенскае прадпрыемства зарэгістравана на падстаўных асоб, якія фактычна не вялі фінансава-гаспадарчую дзейнасць, не заключалі дагаворы і не складалі бухгалтарскую і падатковую справаздачнасць. Іх удзел у дзейнасці прадпрыемства абмяжоўваўся падпісаннем дакументаў. Праверка выявіла факт выплаты наяўных грашовых сродкаў памерламу грамадзяніну за быццам бы набытыя ў яго таварна-матэрыяльныя каштоўнасці. З разліковага рахунку фірмы атрыманы наяўныя грашовыя сродкі, якія па расходных ордэрах выдадзены фізасобам на гаспадарчыя патрэбы. Аднак авансавыя справаздачы праверцы не прадастаўлены, што пацягнула даналічэнне падаходнага падатку ў суме Br12,7 млн. Па выніках праверкі ТАА прад'яўлена да аплаты ў бюджэт Br24 млн, у тым ліку Br21,8 млн падаткаў і Br2,2 млн пені. Матэрыялы праверкі накіраваны ў УДФП КДК па Гродзенскай вобласці для дачы прававой ацэнкі праведзеных здзелак.

**БЕЛТА.**

## ■ Стыхія

## У СВЯТЛЕ МАЛАНАК

**Група навучэнцаў адной са школ Салігорска — адзінаццаць дзяцей у суправаджэнні чатырох выкладчыкаў — адпачывала ў лясным масіве зоны адпачынку «Скакаль» паблізу г.п. Старобін Салігорскага раёна. Увечары баўленне часу на прыродзе скончылася бядой: разрадам маланкі забіла аднаго з дзяцей...**

Падчас навальніцы разрад маланкі ўдарыў у дрэва, па зямлі перайшоў у палатку, дзе знаходзіліся чацвёра дзяцей 1996 года нараджэння. У выніку адзін хлопчык загінуў, астатнія трое — два хлопчыкі і дзяўчынка — пацярпелі. Яны знаходзяцца ў рэанімацыйным і кардыялагічным аддзяленнях. Паводле слоў урачоў, іх стан здавальняючы. Для аказання псіхалагічнай дапамогі на месца здарэння выязджаў спецыяліст Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.

Вялікая навальніца і шквалістае ўзмацненне ветру ў ноч з панядзелка на аўторак у Магілёўскай вобласці моцна ўразілі людзей. Стыхія нанесла і рэальны ўрон: 29 населеных пунктаў засталіся без святла. Адключанымі ад электрычнасці на пэўны тэрмін аказаліся жылыя дамы і фермы ў Бялыніцкім, Магілёўскім, Бабруйскім і Кіраўскім раёнах. Парывы ветру дасягалі 16-20 метраў за секунду: зрывала дахі, выбівала шыбы, ламала дрэвы. У Мсціслаўскім раёне застаўся без даху будынак склада адной з гаспадарак — там ветрам знесла больш за сотню лістоў шыферу. Засталіся без дахаў дамы ў Магілёўскім раёне і нават у абласным цэнтры.

**Сяргей РАСОЛЬКА, Алена КАЗЛОВА.**

У **суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлай **Абаншчынай (Івановай) Наталлі Аляксандраўны,** 27.12.1959 г.н., апошняе месца жыхарства г. Васілевічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці, вул. Калініна, д. 25б, кв. 3. Усіх грамадзян і юрыдычных асоб, якія маюць звесткі пра Абаншчыну (Іванову) Наталлю Аляксандраўну, просім паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна на працягу двух месяцаў на адрас: г. Рэчыца, вул. Леніна, 49.

## ■ Міжнародныя кантакты

## БАЛТЫЙСКІ ФАКТАР

**Учора ў Грамадскім прэс-цэнтры сталічнага Дома прэсы адбыўся «круглы стол» «Беларусь і Літва: сучасны стан і перспектывы супрацоўніцтва». Ён прайшоў у рамках прэс-тура журналістаў літоўскіх сродкаў масавай інфармацыі, якія зараз знаёмяцца з рознымі бакамі жыцця Беларусі.**

Заўважым, што прэс-тур праходзіць літаральна праз некалькі дзён пасля завяршэння работы першага беларуска-літоўскага форуму рэгіянальнага супрацоўніцтва, які прайшоў 8-9 чэрвеня ў Маладзечне. Невыпадкова падчас «круглага стала» былі падведзены папярэднія вынікі маладзечанскай сустрэчы кіраўнікоў рэспубліканскіх і рэгіянальных органаў дзяржаўнага кіравання Беларусі і Літвы, прадстаўнікоў прадпрымальніцкіх структур, у тым ліку вялікага і сярэдняга бізнэсу. Прысутнічалі дэлегацыі 35 гарадоў і раёнаў краіны на чале з мэрамі і віцэ-мэрамі рэгіянальных органаў самакіравання, дэпутамі Сойма Літоўскай Рэспублікі і г.д. Усяго каля 150 чалавек. А агульная колькасць удзельнікаў форуму перавысіла 250 чалавек.

На форуме было заслухана больш за 30 дакладаў і паведамленняў па актуальнай тэматыцы двухбаковага супрацоўніцтва. Адбылася грунтоўная дыскусія. З умовамі вядзення бізнэсу ў Беларусі і перавагамі інвеставання ў яе эканоміку дэлегатаў азнаёміў міністр эканомікі краіны М. Снапкоў. У сваю чаргу, прэзідэнт Канфедэрацыі прамыслоўцаў Літвы Г. Райніс прадставіў свае погляды на стан і перспектывы супрацоўніцтва Літвы і Беларусі ў эканамічнай сферы. У час форуму адбыўся і абмен станоўчым досведам па рэалізацыі сумесных праектаў у перапрацоўчай прамысловасці, лагістыцы, турызме. Па выніках форуму былі падпісаны чатыры двухбаковыя дакументы аб супрацоўніцтве ў розных сферах. Акрамя таго, літоўскія госці ўдзельнічалі ў XII Нацыянальным свяце беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне, а таксама наведалі Міжнародную спецыялізаваную выставу «Белагра - 2012».

Такая цікаўнасць літоўцаў да супрацоўніцтва з нашай краінай зразумелая. Апошнім часам ідзе няўхільнае нарошчванне аб'ёмаў беларускага экспарту, усё больш эфектыўна выкарыстоўваецца патэнцыял сувязяў паміж рэгіёнамі дзвюх краін. Паводле слоў супрацоўніка пасольства Беларусі ў Літве Германа Пузырнага, летась быў дасягнуты рэкордны гандлёвы абарот паміж краінамі, аб'ём якога істотна перавысіў паказчык у мільярд долараў. Сёлета па выніках першага квартала рост беларускага экспарту ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года склаў 73 працэнты. Таксама пэўны рэкорд. На гэтым фоне і праходзіў форум у Маладзечне.

Як нагадала Алена Сушкевіч, намеснік старшыні камітэта эканомікі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, усе беларускія рэгіёны ў час форуму зрабілі прэзентацыі сваіх магчымасцяў. Па водгуках іншых удзельнікаў форуму, яго правядзенне надало новы імпульс развіццю і паглыбленню гандлёва-эканамічнага, навукова-тэхнічнага і гуманітарнага супрацоўніцтва паміж рэгіёнамі дзвюх краін, спрыяла пошуку новых партнёраў. Было вырашана правесці другі такі форум у чэрвені 2013 года ў літоўскіх гарадах Алітус і Друскінінкай.

Беспярэчныя здабыткі ў гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве далі падставу Юрыю Шаўцову, палітычнаму аналітыку, дырэктару Цэнтра праблем еўрапейскай інтэграцыі, павесці размову ў час «круглага стала» пра новую тэндэнцыю ў адносінах нашай краіны з Літвой і Латвіяй. Гэтую тэндэнцыю вядомы палітолаг назваў «балтыйскім фактарам» у эканоміцы Беларусі.

Адным з важных мерапрыемстваў прэс-тура стала паездка ў Астравец на пляцоўку, дзе ўзводзіцца будучая АЭС. Дарэчы, тэма ядзернай энергетыкі была таксама адной з запатрабаваных у час размовы ў Грамадскім прэс-цэнтры. На пытанні літоўскіх журналістаў ужо на пасяджэнні «круглага стала» адказаў Алег Собалеў, загадчык інфармацыйна-аналітычнага аддзела філіяла «Беларускае аддзяленне Расійска-беларускага інфармацыйнага цэнтра па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС» Інстытута радыялогіі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Беларусі. У Астраўцы літоўскія журналісты змаглі грунтоўна распытаць спецыялістаў-ядзершчыкаў і будаўнікоў і атрымаць патрэбную інфармацыю.

Нагадаем, да нас прыехалі прадстаўнікі інфармацыйных агенцтваў BNS і ELTA, Першага балтыйскага канала, штотыднёвіка «Літоўскі кур'ер», Baltios TV і г інш. У час прэс-тура яны таксама наведалі прамысловыя прадпрыемствы, установы і аграсядзібы.

**Леанід ТУГАРЫН.**

## МЯЖА — СУПРАЦОЎНІЦТВУ НЕ ПЕРАШКОДА

**Больш за дзвесце прадстаўнікоў буйнога бізнэсу, рэспубліканскіх і мясцовых органаў дзяржаўнага кіравання сабраў Першы беларуска-літоўскі форум рэгіянальнага супрацоўніцтва ў Маладзечне.**

Варта сказаць, што нашы суседзі прыехалі не з пустымі рукамі. Яны прывезлі шмат новых ідэй і прапаноў. Сур'ёзнасць намераў літоўцаў засведчыў і той факт, што яны запрасілі з сабой прадстаўнікоў міжнароднай адвакацкай канторы.

— Апошнім часам эканамічныя кантакты паміж краінамі развіваюцца асабліва інтэнсіўна, — зазначыў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Літве Уладзімір Дражын. — Аднак мы зразумелі і тое, што трэба прыбавіць у аб'ёмах інвестыцый і гандлі.

Першы намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта Аляксандр Замжыцкі звярнуў увагу прысутных на тое, што за мінулы год знешнегандлёвы абарот сталічнай вобласці і Літвы склаў больш за 124 млн долараў, або амаль 140% да пазалеташняга ўзроўню. У тым ліку экспарт — 73,3 млн, імпарт — 50,9 млн долараў. Сёння паміж рэгіёнамі дзвюх краін заключаны 54 дагаворы аб супрацоўніцтве ў гандлёва-эканамічнай і гуманітарнай сферах.

У Літве запатрабавана такая беларуская прадукцыя, як рапсавы, гарчычны алей, мінеральныя ўгнаенні, воск, парафін і нафтавы вазелін. Суседзі пастаўляюць у нашу краіну прадукты перапрацоўкі нафты, вадкасныя помпы, халадзільнікі, маразільнікі і іншае халадзільнае абсталяванне.

Па словах мэра г. Друскінінкай, прэзідэнта Асацыяцыі самакіравання Літвы спадара Малінаўскаса, Літва назапасіла багаты вопыт выкарыстання сродкаў Еўрапейскага саюза, якія выдаткоўваюцца на мэтавыя праграмы і дазваляюць дзвюм адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам Беларусі і Літвы ажыццявіць той ці іншы інвестыцыйны праект. Дарэчы, паміж Воранаўскім раёнам Беларусі і Шальчынінкайскім раёнам Літвы ўжо дзейнічае пагадненне аб эканамічным і культурным супрацоўніцтве.

Усяго на Міншчыне зарэгістравана 85 арганізацый з удзелам літоўскіх інвестыцый. Па колькасці створаных сумесных прадпрыемстваў з замежным капіталам Літва займае другое месца пасля Расійскай Федэрацыі. Менавіта дзякуючы суседзям у Мінскай вобласці рэалізуецца нямала буйных інвестыцыйных праектаў. У прыватнасці, у Валожынскім раёне будуецца транспартны лагістычны комплекс «БелВінгесЛагістык» коштам 150 млрд рублёў. Першая чарга яго завершана ў 2011 годзе. Другую плануецца здаць у кастрычніку наступнага года. Прадпрыемства «Крупіца» рэалізуе праект па стварэнні вытворчасці па перапрацоўцы насення рапсу ў Нясвіжскім раёне. З удзелам групы кампаній «Viciunai Group» будзе ўзведзены завод па перапрацоўцы морапрадукцыі. Кампанія «Модус Груп» пабудуе аўтацэнтр BMW у Мінскім раёне.

Як спадзяюцца ўдзельнікі форуму, пасля яго правядзення колькасць такіх аб'ектаў значна ўзрасце.

Дадам, што ініцыятыва арганізацыі мерапрыемства такога кшталту належыць Мінскаму абласному выканаўчаму камітэту і Пасольству Беларусі ў Літве. Падчас форуму падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве паміж трыма раёнамі нашай краіны і Літвы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**


**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ГРОДНЕНСКОГО ФИЛИАЛА ГРОДНЕНСКОГО ОБЛАСТНОГО ПОТРЕБИТЕЛЬСКОГО ОБЩЕСТВА**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика | Здание склада (капитальное строение с инвентарным номером 401/С-14087), общей площадью 204,1 кв.м, площадь застройки 221 кв.м, фундамент – бетонный, стены – кирпичные и бревенчатые, перегородки – кирпичные, крыша – шифер, полы – бетон, проемы дверные – металлические ворота, электроснабжение – кабель ввода, вентиляция – естественная. |
| Местонахождение объекта | Гродненская область, Гродненский район, г. Скидель, ул. Железнодорожная, 10А |
| Земельный участок | Кадастровый № 422050400002002168. Площадь земельного участка 0,0602. Назначение – для эксплуатации и обслуживания здания утильсклада. |
| Начальная цена продажи | 125 524 000 (сто двадцать пять миллионов пятьсот двадцать четыре тысячи) белорусских рублей с учетом НДС |
| Сумма задатка | 12 552 400 (двенадцать миллионов пятьсот пятьдесят две тысячи четыреста) белорусских рублей. |
| Продавец | Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230003, г. Гродно, Озерское шоссе, д. 41, тел. 746807. |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41 98 32, 41 98 34 |
| Условия аукциона | Без условий |
| Условия оплаты | По договоренности сторон |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |
| **Аукцион состоится 17 июля 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209** | |

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30. Последний день приема заявлений – 16 июля 2012 г. до 15.00.**

**Телефоны для справок: 41 98 32, 41 98 34 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

# МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

13 чэрвеня 2012 г.
№ 11 (283)


ЗВАРОТ У РЭДАКЦЫЮ

## Халоднай вады не хапае, гарачай няма

**У карэспандэнцкі пункт «Звязды» па Віцебскай вобласці звярнуліся жыхары гарадскога пасёлка Янавічы Віцебскага раёна, якія паскардзіліся на праблемы з водазабеспячэннем шматкватэрных дамоў і інтэрната.**

Жыхароў глыбінкі хвалюе канкрэтнае пытанне забеспячэння халоднай вадой кватэр на трэцім паверсе дамоў №№ 5 і 6 па вуліцы Юбілейная, а таксама на пятым паверсе інтэрната жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

Паводле слоў жыхароў пасёлка, вось ужо прыкладна пяць гадоў халодная вада перыядычна не падаецца ў названыя дамы — на трэці паверх, а таксама ў інтэрнат ЖКГ — на пяты паверх. Пры гэтым на ніжніх паверхах гэтых дамоў вада амаль заўсёды ў кранах ёсць.

Людзі тлумачаць праблему тым, што труба, пракладзеная на тэрыторыі ўчастка ЖКГ, ужо гадоў пяць працякае.

— Трубу гэтую не мяняюць і не засыпаюць. І выцякае наша вада на вуліцу, — наракаюць жыхары пасёлка. — Куды толькі ні тэлефанавалі: кіраўніцтву ўчастка ЖКГ, кіраўніцтву камунальнай арганізацыі пры Віцебскім райвыканкаме, але дарма толькі час патрацілі...

Як растлумачылі людзі, калі халодная вада нават і падаецца, напор яе вельмі слабы. У выніку тыя, у каго дома ёсць газавыя калонкі, не могуць нармальна імі карыстацца. Акрамя таго, у названым інтэрнаце на пятым паверсе зімой не функцыянавала ацяпленне...

На жаль, даводзіцца канстатаваць, што чамусьці менавіта з Віцебскага раёна ў карэспандэнцкі пункт «Звязды» за апошнія дзесяць гадоў паступала нямала скаргаў, і ў асноўным — на дрэнную працу камунальнікаў. З просьбай дапамагчы жыхарам пасёлка Янавічы карэспандэнт пісьмова звярнуўся асабіста да старшыні аблвыканкама

Аказваецца, за перыяд мінулага ацяпляльнага сезона пісьмовых зваротаў ад жыхароў гарадскога пасёлка Янавічы ва ўнітарнае прадпрыемства ЖКГ Віцебскага раёна «Вітрайкамгас» па пытанні няякаснага ацяплення не было. І начальнік аддзела ЖКГ у афіцыйным адказе канстатаваў: «Таксама за гэты перыяд фактаў «недаацяплення» не зафіксавана». (Між іншым, а хто з камунальнікаў наведваў названае жыллё?)

Паводле слоў адказнай асобы, у гарадскім пасёлку Янавічы ў шматкватэрных жылых дамах гарачае водазабеспячэнне не прадугледжана. Для забеспячэння гарачай вадой жыльцы ў індывідуальным парадку могуць набыць воданагравальнікі і ўстанавіць іх у кватэрах. «Сёння пытанне аб гарачым водазабеспячэнні ў г.п. Янавічы не разглядаецца ў сувязі з адсутнасцю грашовых сродкаў (у тым ліку крыніцы фінансавання) і дадатковых магутнасцяў цеплакрыніцы (кацельні)».

А ці пацвердзіліся скаргі наконт праблем з падачай халоднай вады? Камунальнікі выехалі на месца і высветлілі, што перабоі з халодным водазабеспячэннем на верхніх паверхах шматкватэрных дамоў па вуліцы Юбілейная сапраўды былі выкліканы прарывамі трубаправода.

— Зараз аварыйная сітуацыя ліквідавана. Было таксама ўстаноўлена, што у выніку выхаду са строю помпавай часткі адбываецца паніжэнне ціску ў трубаправодзе ў пікавыя гадзіны разбору вады, — парадаваў веданнем тэхнічных нюансаў начальнік аддзела ЖКГ. — Зараз шукаюць сродкі на набыццё неабходных матэрыялаў для рамонтна-аднаўленчых работ. Плануем выканаць іх да сярэдзіны чэрвеня.

**Ад аўтара.** *Парада чытачам, якія сутыкаюцца з камунальнымі і іншымі праблемамі — скардзьцеся ў інстанцыі пісьмова. Людзі сказалі, што тэлефанавалі камунальнікам, а кіраўнік ЖКГ канстатуе адсутнасць пісьмовых зваротаў... Выходзіць, вусныя звароты не прымаюцца ў якасці такіх? Наконт выезду камунальнікаў на месца. А што, без умяшальніцтва газеты ніхто не ведаў, што ёсць парывы трубаправода? І пра тое, што помпу трэба адрамантаваць?*

*У камунальнікаў, асабліва ў глыбінцы, шмат праблем. Можа, і насамрэч работу кожнай помпы кантраляваць цяжка. Але ж пры гэтым ад нас патрабуюць своечасова аплачваць камунальныя паслугі. Зразумела, скажуць мне работнікі гэтай структуры, бо насельніцтва аплачвае толькі частку ад поўнага рыначнага кошту тых самых паслуг! Але ж апошнія не хуткімі тэмпамі, ды даражэюць. І ўсё ідзе да таго, што ў выніку мы будзем аплачваць «камуналку» на сто працэнтаў... Застаецца пытанне і да дэпутатаў раённага ўзроўню: чаму своечасова не падключыліся да вырашэння канкрэтных праблем сваіх выбаршчыкаў? Таксама не атрымалі пісьмовага звароту?*

*Напрыканцы ідэя «з барадой»: чаму б на тых жа «жыроўках» не друкаваць кантактныя тэлефоны дэпутатаў ад акругі, участковага міліцыянера? Каб апошнія заўсёды былі на сувязі з людзьмі.*

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## Гродна «акальцавалі»

Барыс ПРАКОПЧЫК

### У горадзе над Нёманам рэалізаваны доўгачаканы дарожны праект: пабудавана аб'язная магістраль

**Ідэя кальцавой дарогі (агульнай працягласцю 20,3 кіламетра) была закладзена яшчэ ў генеральным плане развіцця абласнога цэнтра ў 1975 годзе. Але тады яе ўдалося рэалізаваць толькі на 40 працэнтаў (гэта 9 кіламетраў). Потым, з 1991-га па 2011-ы, пабудавалі яшчэ 4,2 кіламетра. Зразумела, што з такімі тэмпамі перспектыва замкнуць кальцо ўяўлялася вельмі аддаленай. Аднак з мая мінулага года зрабілі амаль удвая больш, чым за папярэдняе дваццацігоддзе. Ёсць аб'язная магістраль!**

Гэта той выпадак, калі вельмі важны рэгіянальны праект быў падтрыманы на вышэйшым узроўні (старшыня аблвыканкама Сямён Шапіра звярнуўся да кіраўніка дзяржавы, і з рэспубліканскага бюджэту на будаўніцтва аб'язной дарогі ў Гродне было выдаткавана 240 мільярдаў рублёў), а мясцовыя ўлады і арганізатары будоўлі прыклалі ўсе намаганні, каб эфектыўна выкарыстаць гэтыя сродкі. Якім чынам?

Інстытут «Гродназграмадзянпраект», які ўзначальваў Уладзімір Дзяшко (з нядаўняга часу — намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама), упершыню ў нашай краіне ўкараніў інжынірынгавы метад будаўніцтва. Гэта значыць, што інстытут узяў на сябе функцыі не толькі праекціроўшчыка, але і заказчыка будаўніцтва, і нават — фактычна — абавязкі генпадрадчыка. Прычым гэтыя падыходы з'явіліся не знянацку, а ўжо былі апрабаваны на шэрагу аб'ектаў. І з улікам атрыманага вопыту іх паспяхова выкарысталі на будоўлі аб'язной магістралі.

— Сваю першачарговую задачу мы бачылі ў тым, каб забяспечыць максімальную эканомію сродкаў, — зазначае Уладзімір Дзяшко. Напрыклад, выбіраліся такія варыянты, каб выкарыстаць пясчаны грунт мясцовых узгоркаў, што значна танней у параўнанні з расходамі па яго транспарціроўцы з кар'ера. Толькі на гэтым зэканомлена каля 8 мільярдаў рублёў.

Абласная ўлада прыцягнула на гэты аб'ект будаўнікоў амаль з усёй Гродзеншчыны. У выніку з аб'ёмам работ, разлічаным, як меркавалі, як мінімум гады на тры, справіліся за год. Горад над Нёманам цяпер мае новую чатырох-, шасціпалосную аўтамагістраль з двума пуцеправодамі цераз чыгунку. Паводле разлікаў, пераарыентацыя вялікай колькасці транспартных сродкаў з цэнтральнай часткі горада на аб'язную дарогу прыкладна на 10 працэнтаў знізіць затраты на эксплуатацыю транспарту, што раўназначна гадавому эканамічнаму эфекту ў 150 мільярдаў рублёў. Прагназуецца эканомія 3,5 тысячы тон паліва ў год, а значыць, і істотнае скарачэнне шкодных выкідаў у атмасферу.

МЯСЦОВЫ ЧАС

## ДАРОГІ, ЯКІЯ МЫ ВЫБІРАЕМ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Колькі б надзённых пытанняў ні выпадала вырашаць Доўскаму сельскаму Савету дэпутатаў, яго старшыня Уладзімір Белавусаў заўсёды знаходзіць час на стасункі з моладдзю, цікавіцца яе праблемамі.

Апошнім часам у аграгарадку Доўск створаны добрыя ўмовы для фізічнага развіцця падлеткаў, арганізацыі іх вольнага часу. Але калі хочаш, каб маладыя не разбегліся, трэба найперш ствараць сацыяльныя ўмовы. Вырашыцца гэтая задача — вырашыцца і праблема з кадрамі.

— Увогуле, у нашым сельсавеце 16 населеных пунктаў, — кажа Уладзімір Дзмітрыевіч. — І мы імкнёмся, каб жыхары кожнай вёскі адчувалі клопат пра сябе. У гэтым дапамагаюць давераныя асобы і дэпутацкі корпус.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**

ТЭМА ДНЯ

## НЕ ХОЧАШ УПАСЦІ — ТРЫМАЙСЯ ЗА ЗЯМЛЮ

Наталля КАРПЕНКА

**Што такое вёска? Маленькая, вялікая, перспектыўная і не вельмі? Па вялікім рахунку, гэта асяроддзе, дзе яшчэ захоўваюцца ў жывым выглядзе народныя традыцыі, дзе асновы духоўнасці і маральнасці не замураваны ў асфальт і не падпарадкаваны дыктату высокіх тэхналогій... Кожны вясковец, хоча ён таго ці не, стаіць на зямлі, яе апрацоўвае, з яе жыве. Жыве, магчыма, не так багата, як хацелася б. Але пры любым раскладзе мае на сваім стале, як той казаў, і шкварку, і да шкваркі. І будзе мець, калі падтрымка ўласных падсобных гаспадарак і надалей застанецца прыярытэтным кірункам дзяржаўнай палітыкі.**

Але вясковы чалавек жыве не толькі ўласнай гаспадаркай, яго праблемы трэба разглядаць значна шырэй — развіваць сацыяльна-бытавую сферу, будаваць амбулаторыі, школы, установы культуры і быту і г.д. Словам, ствараць нармальныя ўмовы для жыцця і працы. Работу ўладаў Лепельскага раёна па фарміраванні такіх умоў якраз і ацэньвалі члены Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання падчас выязнога пасяджэння.

Забягаючы наперад, скажу, што ацанілі станоўча. Не толькі працу асобных сельсаветаў і асобнага Лепельскага раёна, а саму сістэму, якая склалася ў вобласці, самі падыходы да вырашэння праблем жыццезабеспячэння сельскага насельніцтва.

...Са старшынёй Каменскага сельскага Савета дэпутатаў Мікалаем Сініцыным знаёма даўно, неаднойчы нашы шляхі перасякаліся падчас выездаў у іншыя рэгіёны. Праўда, тады Мікалай Мікалаевіч, які таксама з'яўляецца членам Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання, выступаў, хутчэй, у ролі эксперта ці экзаменатара. На гэты раз здаваць экзамен — сваім калегам па «цэху» — давялося яму самому.

У 2005 годзе пры Каменскім сельвыканкаме было створана першае камунальнае ўнітарнае прадпрыемства (КУП) для аказання паслуг мясцоваму насельніцтву. Якія менавіта паслугі меліся на ўвазе? Тыя, што запатрабаваны ў вёсцы круглы год, толькі з невялікай «папраўкай» на сезоннасць: дастаўка і нарыхтоўка дроў і іншых відаў паліва, сяўба і ўборка на прысядзібных участках, апрацоўка глебы...

— Такія віды паслуг неабходныя ў сельскай мясцовасці, асабліва пажылым людзям. Яны яшчэ хочуць займацца прысядзібнай гаспадаркай, але сілы ўжо не тыя, — тлумачыць Мікалай Сініцын. — І вось тут на дапамогу прыходзіць наша прадпрыемства.

«Каменьаграсэрвіс» (так называецца КУП) не ставіць мэтай атрыманне вялікага прыбытку. Яго галоўная задача — аказаць максімум паслуг па нізкіх расцэнках, задаволіць надзённыя патрэбы людзей. Напрыклад, дастаўка дроў абыдзецца чалавеку (той жа вясковай бабулі) напалову танней, чым аналагічная паслуга гарадской спецыялізаванай арганізацыі.

**(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)**

## Без надбавак нават больш

**Бібліятэкары Віцебшчыны, зразумела, не ўзрадаваліся з той нагоды, што ім з абласнога бюджэту больш не выплачваюць «мясцовыя» надбаўкі. І, безумоўна, у многіх з іх узнікла рэзоннае пытанне: чаму?**

— У адпаведнасці з палажэннямі артыкула Закона Рэспублікі Беларусь ад 20.02.1991 года «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні», мясцовыя Саветы дэпутатаў мелі права самастойна ўстанаўліваць работнікам бюджэтнай сферы даплаты і надбаўкі да службовых акладаў і тарыфных ставак. У сувязі з чым і было прынята рашэнне Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў (№ 229) «Аб устанаўленні надбавак работнікам бібліятэчнай сістэмы Віцебскай вобласці», у адпаведнасці з якім (у залежнасці ад адукацыі і групы па аплаце працы) памер надбавак складаў ад 80 да 200 тысяч рублёў на аднаго работніка, — паведамілі карэспандэнту ва ўпраўленні культуры Віцебскага аблвыканкама. — Аднак Законам Рэспублікі Беларусь «Аб мясцовым кіраванні і самакіраванні» ад 4 студзеня 2010 года ўказаныя паўнамоцтвы ўжо не прадугледжаны...

Як адзначыла выканаўца абавязкаў начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Ларыса Аленская, для прывядзення пытання аплаты працы бібліятэчным работнікам у адпаведнасць з дзейным заканадаўствам было прынята рашэнне Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў (ад 28 снежня 2011 года № 158) аб адмене надбавак.

Але сёлета з пачатку года павысілася тарыфная стаўка 1 разраду. Сярэдняя зарплата бібліятэчных работнікаў з 1.01.2012 года склала больш за 1,6 мільёна рублёў. І рост у параўнанні з лістападам мінулага года, калі зарплата налічвалася з улікам надбавак, склаў каля 15-18 працэнтаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

РАСКЛАД НА ЗАЎТРА

## СПАЧАТКУ — РОЎНЫЯ ЎМОВЫ, ПОТЫМ — КАНКУРЭНЦЫЯ

**Пра асноўныя кірункі развіцця дзяржавы на сучасным этапе ішла размова падчас сустрэчы Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Анатоля РУБІНАВА са старшынямі гарадскіх і раённых Саветаў дэпутатаў.**

Эканоміка — вось тое, на што будзе зроблена стаўка. Пад эканомікай маецца на ўвазе і вытворчасць працы, і якасць прадукцыі, і зніжэнне яе энерга- і матэрыялаёмістасці. Самі па сабе гэтыя эканамічныя складнікі не «намалююцца» — яны стануць вынікам мадэрнізацыі вытворчасці і пераходу на самыя сучасныя тэхналогіі. У сваю чаргу, і мадэрнізацыя, і тэхналогіі запатрабуюць вялікіх укладанняў.

Так, калі коратка, можна вызначыць «квінтэсэнцыю» выступлення кіраўніка верхняй палаты парламента.

Цяпер — больш падрабязна. Калі сёння мы трацім шмат энергіі на выпуск адзінкі той ці іншай прадукцыі, гэта зусім не азначае, што нам гэта падабаецца. Проста, каб траціць у 10 разоў менш, неабходна спачатку ў 100 разоў больш укласці: у набыццё адпаведных тэхналогій, абсталявання і г.д. І рабіць гэта давядзецца, бо іншага шляху няма: для таго, каб нашу прадукцыю можна было прадаваць за мяжой, яна павінна мець адпаведную якасць. І цану. І нават пры гэтых умовах — умовах аптымальнага спалучэння цаны і якасці — тавар трэба яшчэ ўмець прадаць. Адсюль вынікае, што неабходна заваёўваць сусветныя рынкі. Але ў складаных і жорсткіх канкурэнтных умовах выстаяць у адзіночку немагчыма. Таму сёння ні адна краіна ў свеце не можа быць цалкам незалежнай ад іншых, нават такая моцная, як ЗША, не кажучы ўжо пра невялікія дзяржавы.

— Курс на кааперацыю, на саюзныя ўтварэнні вельмі важны сёння — гэта можа дапамагчы краінам паспяхова развівацца, — сказаў Анатоль Рубінаў. — Бо колькі ні размахвай сцягамі, ні крычы пра незалежнасць, багацейшым ад гэтага не будзеш. Ступень свабоды вызначаецца тым, якія матэрыяльныя рэсурсы ты маеш. Таму нам патрэбна эканамічная трываласць. А шлях да яе ляжыць праз саюзныя ўтварэнні, у першую чаргу — праз Саюзную дзяржаву, праз збліжэнне Беларусі і Расіі. Інтэграцыя ў гэтым кірунку будзе развівацца і далей, як і ў кірунку Еўразійскага эканамічнага саюза.

Для таго, каб такія саюзы дзяржаў былі жыццяздольнымі, неабходна, каб краіны-ўдзельніцы мелі роўныя ўмовы гаспадарання. Спачатку — стварэнне аднолькавых умоў, а потым ужо — канкурэнцыя.

Сёння Расія таксама ўсвядоміла неабходнасць інтэграцыі з суседзямі — на тых умовах, якія гэтых суседзяў задавальняюць. Таму цяперашні этап нашых з ёю стасункаў, на думку Анатоля Рубінава, усяляе аптымізм.

— Нельга скідваць з рахункаў і супрацоўніцтва з іншымі краінамі, — адзначыў ён. — Тым больш, што за апошнія гады карціна свету каласальна змянілася. Тыя краіны, якія яшчэ нядаўна, вобразна кажучы, драмалі, сёння з фантастычнай хуткасцю ператвараюцца ў эканамічна моцныя дзяржавы з вялікімі перспектывамі. Тыя ж Індыя, В'етнам, краіны Паўднёвай Амерыкі... Не кажучы ўжо пра Кітай, які па сваёй эканамічнай магутнасці саступае сёння хіба што адной краіне ў свеце, а неўзабаве можа перагнаць яе.

Так што будаваць адносіны трэба ў розных геаграфічных кірунках, але перш за ўсё ісці туды, дзе можна заняць сваю нішу, дзе ёсць перспектыва выгадна прадаць сваю прадукцыю.

Увогуле, усе мы жывём так, як працуем, і маем тое, што зарабляем. Будзем працаваць лепш — будзем лепш жыць. З утрыманскімі настроямі моцную эканоміку не пабудуеш. Таму кожны павінен адказваць за сябе сам, спадзявацца ў першую чаргу на ўласныя сілы, а не на дзяржаву.

— І вам трэба ўвесь час даносіць гэта да людзей, — звярнуўся Анатоль Рубінаў да старшынь Саветаў дэпутатаў. Ён падкрэсліў, што дзяржава ў нас сапраўды для народа. Але і грамадзяне не павінны забываць пра свае абавязкі перад ёю.

**Наталля УЛАДЗІМІРАВА.**

**Андрэй ТУР, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:**

*— Беларусь, паводле класіфікатара, адносіцца да малых індустрыяльных краін. Што гэта азначае? Тое, што мы малыя па тэрыторыі — 207 тыс. м², па колькасці насельніцтва — 9 млн 460 тыс. чалавек і па наяўнасці рэсурсаў — усяго 6% ад патрэбы (мы маем калійныя ўгнаенні, лес, крыху нафты і ваду).*

*Да таго ж наша краіна доўгі час фарміравалася як «індустрыяльны комплекс» былой вялікай дзяржавы, які спецыялізаваўся на выпуску складанай канчатковай матэрыяльнай прадукцыі.*

*Гэтыя ўмовы ператварылі нас у краіну з вельмі высокай ступенню адкрытасці эканомікі. Мы шмат прадаём (каб зарабіць валюту) і купляем. Таму катастрафічна залежым ад умоў, якія фарміруюцца на знешніх рынках, залежым ад рэсурсаў і цэн на рэсурсы. Цэны на рэсурсы ў свеце за апошнія 15—20 гадоў выраслі ў 5—7 разоў, а значыць, у столькі разоў вырас і кошт імпарту, які мы вымушаны купляць.*

*У той жа час кошт гатовай прадукцыі на сусветных рынках мае тэндэнцыю да зніжэння. Сітуацыя ў выніку складваецца не на нашу карысць: тое, што мы купляем, даражэе, а тое, што мы прадаём, таннее. У пераадоленні гэтай сітуацыі і заключаецца асаблівасць нашай эканамічнай палітыкі: мы павінны, з аднаго боку, скарачаць колькасць імпарту на адзінку гатовай прадукцыі, з другога — любымі шляхамі нарошчваць экспарт. Вось дзве асноўныя задачы, якія стаяць перад намі сёння.*

МЫ — ВАМ, ВЫ — НАМ

## НА МІНШЧЫНУ — ПА ВОПЫТ

**З дзвюма канкрэтнымі мэтамі наведала Мінск дэлегацыя Заканадаўчага сходу Ніжагародскай вобласці Расіі. Па-першае, абмеркаваць перспектывы падпісання пагаднення аб узаемным супрацоўніцтве з Мінскім абласным Саветам дэпутатаў. Па-другое, азнаёміцца з работай аграрна-прамысловага сектара.**

Па словах старшыні сходу Яўгена Лебедзева, сельская гаспадарка і перапрацоўчая прамысловасць Беларусі працуюць вельмі эфектыўна. «На жаль, ніжагародцы значна адстаюць у гэтым кірунку. Таму нам хацелася б пераняць вопыт і адаптаваць яго да сваёй вобласці, — зазначыў ён. — Невыпадкова ў складзе дэлегацыі адразу пяць прадстаўнікоў аграпрамысловага камітэта, а наша праграма скіравана на наведванне гаспадарак АПК».

Прыемна ўразіла расіян, што на Міншчыне з карысцю выкарыстоўваецца зямля, палеткі акуратна засеяны і дагледжаны. «На Ніжагародчыне вялікая колькасць зямлі пустуе, паколькі знаходзіцца ў руках людзей, якія не маюць ніякага дачынення да сельскай гаспадаркі. Таму мы прымаем паступовыя захады, каб яна працавала. Але работы тут яшчэ шмат», — заўважыў Яўген Лебедзеў. Цікавіў гасцей і вопыт работы мясцовай улады і Саветаў дэпутатаў па добраўпарадкаванні населеных пунктаў.

Разам з тым, расійскі госць распавёў, што Ніжагародчына ў большай ступені прамысловы рэгіён. І беларусам, відаць па ўсім, былі б цікавыя дасягненні ў эканоміцы, фундаментальных навуках, нанатэхналогіях.

Старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Святлана Герасімовіч падкрэсліла, што такія сустрэчы карысныя для абодвух бакоў. «Вам ёсць чаму павучыцца ў нас, а нам — у вас, як у развіцці заканадаўства, так і тэрыторый». Яна нагадала таксама, што дэпутаты Мінскай вобласці супрацоўнічаюць са сваімі калегамі з некаторых расійскіх рэгіёнаў. У прыватнасці, пагадненні падпісаны з Заканадаўчым сходам Ленінградскай вобласці і Маскоўскай абласной думай.

Дадам, што расійскія дэпутаты нібы падгадалі з візітам на Міншчыну. Якраз у тыя дні праходзіла 22-я спецыялізаваная Міжнародная выстава «Белагра -2012», дзе госці азнаёміліся з дасягненнямі сельскагаспадарчай галіны Беларусі і замежных краін. Наведалі яны і ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі», цэнтр экалагічнага турызму «Станькава», музей народных рамёстваў «Дудуткі».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

■ Вяртаемся да надрукаванага

# «МУЗЕЙ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ»

Артыкул «Музей Вялікай Айчыннай», апублікаваны ў газеце «Звязда» 08.05.2012, разгледжаны ва УП «УКБ Мінгарвыканкама».

Адносна ўзнятых пытанняў у частцы праектавання новага будынка дэпазітарыя інфармуем.

У цяперашні час ПКУП «Мінскпраект» праектуе адміністрацыйна-гаспадарчы блок з дэпазітарыем музея Вялікай Айчыннай вайны ў раёне вул. 1-е Кальцо — вул. Ціміразева. Тэхніка-эканамічныя паказчыкі аб'екта наступныя:

— агульная плошча адміністрацыйна-гаспадарчага блока — 5050 кв.м, у якім будуць працаваць 200—250 чалавек;

— плошча фондасховішча — 6790 кв.м;

— рэстаўрацыйных майстэрняў — 2010 кв.м.

Праектныя рашэнні прадугледжваюць аптымальныя ўмовы па захаванні ўнікальных экспанатаў, а таксама сучасныя майстэрні па іх рэстаўрацыі і аднаўленні.

Рэалізацыя гэтага праекта дасць магчымасць атрымаць сучасны комплекс, які дазволіць аднаўляць унікальныя рарытэты як музея ВАВ, так і іншых музеяў Рэспублікі Беларусь.

Тэрміны будаўніцтва будуць вызначацца з улікам каштарыснага кошту аб'екта, нарматыўнай працягласці будаўніцтва і наяўнасці фінансавання.

Праектныя работы плануецца завяршыць у гэтым годзе.

**Л. ПРАЦЬКО, намеснік дырэктара камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Упраўленне капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама».**

❍ ❍ ❍

Міністэрствам культуры разгледжаны артыкул «Музей Вялікай Айчыннай», які быў надрукаваны ў газеце «Звязда» 08.05.2012. Па выніках разгляду паведамляем наступнае.

Канцэпцыя экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і яе мастацкае рашэнне разгледжаны і ўхвалены Рэспубліканскай навукова-метадычнай радай па пытаннях музейнай справы. Музей рыхтуе заданне на стварэнне экспазіцыі для аб'яўлення конкурсу.

Узвядзенне новага будынка музея і стварэнне экспазіцыі ў ім вядзецца ў адпаведнасці з распрацаванымі графікамі ў цесным узаемадзеянні Міністэрства культуры і музея з Мінскім гарвыканкамам, які з'яўляецца заказчыкам аб'екта.

Пытанне аб перамяшчэнні калекцый музея з будынка па пр. Незалежнасці, 25а ў іншы будынак, а таксама будаўніцтва дэпазітарыя прапрацоўваецца Мінскім гарвыканкамам сумесна з Міністэрствам культуры. Пры прыняцці канчатковага рашэння будуць улічаны патрабаванні заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь у частцы забеспячэння захаванасці музейных прадметаў.

**Т. СТРУЖЭЦКІ, намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь.**

**АД РЭДАКЦЫІ. Праблемныя пытанні адносна перспектыў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны газета «Звязда» будзе трымаць на кантролі** ■

# ВЕТЭРАНЫ ЗАНЕПАКОЕНЫ

Ветэранаў вайны і працы Партызанскай раённай арганізацыі г. Мінска вельмі ўстрывожыў артыкул у газеце «Звязда», апублікаваны 8 мая 2012 года, — «Музей Вялікай Айчыннай». Мы з вялікай цікавасцю назіраем за будаўніцтвам новага будынка для музея, унеслі пасільны фінансавы ўклад у гэтую сапраўды народную будоўлю і з нецярплівасцю чакаем адкрыцця экспазіцый.

З музеем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны мы супрацоўнічаем даўно, праводзілі шмат сумесных мерапрыемстваў, прысвечаных выхаванню моладзі ў духу любові да сваёй Радзімы, гонару за справы сваіх гераічных продкаў. Імкнёмся, каб маладое пакаленне даведвалася гістарычную праўду аб Вялікай Айчыннай вайне па праўдзівых дакументах таго часу, а не па кнігах фальсіфікатараў гісторыі. І тут галоўная наша зброя — зафіксаваны ў дакументах музея ўклад беларускага народа ў выратаванне свету ад фашысцкай чумы. Дакументы пра зверствы фашыстаў, гераізм і самаахвярнасць народа пачалі збірацца з 1942 года ў партызанскіх атрадах, падпольных групах, іх усімі шляхамі стараліся адправіць на «Вялікую зямлю» для праўдзівага адлюстравання падзей тых дзён і захавання на будучыя часы.

Аднак тое, што толькі 10% фондаў музея плануецца перавесці ў новы будынак, выклікае цалкам абгрунтаваную трывогу. Выклікае непакой, што фондасховішча толькі праектуецца і будзе размешчана далёка ад музея. Чаму яно праектавалася не ў першую чаргу, а пакінута на далёкія тэрміны? Што гэта: звычайная неразважнасць або, як сцвярджаюць чуткі, якія распаўсюджваюцца ў народзе, — спланаваная акцыя, якая будзе садзейнічаць страце шэрагу дакументальных матэрыялаў?

Мы былі ўпэўнены, што ў новым будынку музея будуць не толькі афармлены экспазіцыі па сучасных музейных тэхналогіях, але і створаны належныя ўмовы для захавання яго ўнікальных экспанатаў, аналагаў якім няма ні ў адным музеі свету. Ветэраны лічаць недапушчальным нават кароткатэрміновае захоўванне фондаў у непрыстасаваных памяшканнях. Гэта можа стварыць пагрозу псавання і страты каштоўнасцяў, якія там захоўваюцца.

Жывых захавальнікаў памяці пра вайну застаецца з кожным годам усё менш, а колькасць ахвотных адабраць у нас Перамогу, перагледзець вынікі вайны множыцца. Для ветэранаў, якія засталіся ў жывых, застаецца ў сіле наказ: зрабіць усё, каб памяць пра подзвігі народа не згасла ў вяках.

Мы вельмі просім рэдакцыю «Звязды» з мэтай захавання бясцэнных фондаў музея ўзяць пад кантроль планамерны пераезд каштоўнасцяў фондасховішча ў новы будынак музея, які будуецца, і спадзяёмся, што памяць пра народны подзвіг будзе захавана для нашчадкаў.

**По даручэнні ветэранаў Партызанскага раёна г. Мінска Р.С. РАМАНОЎСКАЯ, старшыня савета ветэранаў.**



# «...АЛЕ ЁН НЕ ЛОМІЦЦА!»

— Рыхтуй сані летам, а кошыкі... круглы год, — смяецца Іван Васільевіч Васілевіч з вёскі Гарэнічы, заканчваючы плесці чарговы «твор».

Гэтай справай ён стаў займацца гадоў трынаццаць таму, пасля таго, як стаў інвалідам. «Колькі чаго наплёў» — ужо і не ўспомніць. А вось пра тое, што яго вырабы служаць не толькі землякам-бярэзінцам, але і ўкраінцам ды расіянам, гаворыць з гонарам. Бо яно ж і сапраўды — абы-што за блізкі свет чалавек не павязе.

Нарыхтоўваць лазу Івану Васільевічу дапамагаюць сямейнікі. Яны ж, гледзячы на яго спрытныя рухі, бывае, таксама спрабуюць нешта зрабіць. Але да поспехаў майстра ім далёка. Гэта ў яго, калі іншай работы няма, за месяц выходзіць каля 25 кашоў. І ў хаце яны доўга не ляжаць.

— Іван — сапраўдны гаспадар! — не нарадуецца на яго жонка. — Сам падлогу ў доме пераслаў, сам дровы пілуе і коле, а ўжо пляце...

Некалькі яго прыгожых вырабаў з лазы старшыня Бярэзінскага раённага таварыства інвалідаў Ніна Мацвееўна Бурко прывезла калісь на прэзентацыю «Звязды». Тады ж зазначыла, што Іван Васільевіч і сам нібы тая лаза: лёс гне, гняце яго, але ж ён не ломіцца!

**Марына БЕГУНКОВА, фота аўтара.**
*Бярэзінскі раён.*

# ПАЛЯЎНІЧЫЯ, УНОСЬЦЕ ПРАПАНОВЫ

**Міністэрства лясной гаспадаркі разам з зацікаўленымі дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі вядзе работу па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў ва Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №580 «Аб некаторых мерах па павышэнні эфектыўнасці вядзення паляўнічай гаспадаркі і рыбагаспадарчай дзейнасці, удасканальванні дзяржаўнага кіравання імі».**

Дапаўненні і змяненні датычацца «Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання». Таму міністэрства заклікае і паляўнічыя гаспадаркі, і паляўнічых уносіць свае прапановы па гэтым пытанні. Да 20 чэрвеня іх можна накіраваць у Мінлясгас спецыялістам па электронных адрасах: zubko@ministry.mlh.by; shastakou@ministry.mlh.by. Таксама неабыякавыя і зацікаўленыя грамадзяне і юрасобы могуць выказаць свае заўвагі і прапановы па тэлефоне 8 (017) 200 49 61.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**


**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА**

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Минского районного потребительского общества (продавец)**

**ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН**

**по продаже здания магазина, об. пл. 128,5 кв.м, инвентарный номер 600/С-105006, расположенного по адресу: Минский район, Крупицкий с/с, д. Закружка.**

**Начальная цена с НДС – 227 874 000 бел. руб.**

Площадь земельного участка – 0,1217 га (предоставлен продавцу на праве постоянного пользования).

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012108260016; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в евро (EUR) – 3012108260032; в долларах США (USD) – 3012108260029; в российских рублях (RUB) – 3012108260045; в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК 153001369, г. Минск, УНП 690324015 Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

**Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.**

*Предыдущее извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 15.11.2011.*

Аукцион состоится **26.06.2012** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.06.2012** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 224 61 34; 500 47 12.**


# ДА БЯДЫ ДАВЁЎ ХАЛАДЗІЛЬНІК

**У Смаргоні работнікі МНС на пажары выратавалі пажылую жанчыну. Папярэдняя прычына здарэння — кароткае замыканне электраправодкі халадзільніка.**

— Было амаль шэсць гадзін раніцы, калі паступіў выклік на пажар драўлянага дома па вуліцы Першамайскай. Званіла суседка. Калі ў жылы пакой патрапіла звяно газадымахоўнай службы, «прабіўшыся« праз шчыльнае задымленне ў доме, гаспадыня без прытомнасці ляжала на падлозе каля ложка, — расказалі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. — Пацярпелую з апёкам лёгкіх і атручэннем прадуктамі гарэння даставілі ў бальніцу. Стан пенсіянеркі 1940 года нараджэння быў цяжкі... У выніку пажару згарэў халадзільнік «Мінск». Часткова пашкоджана перакрыццё.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# АД УСПЫШКІ ПАРОЎ ЗАГАРЭЛАСЯ АДЗЕННЕ

**У Мінску з-за неасцярожнасці пры абыходжанні з растваральнікам атрымала апёкі маладая жанчына.**

У кухні кватэры жылога дома па вуліцы Убарэвіча адбылася ўспышка лёгкаўзгаральнай вадкасці — хутчэй за ўсё, растваральніку, мяркуюць спецыялісты МНС. Жыллё належыць непрацуючаму мужчыне 1973 года нараджэння, інваліду другой групы па апорна-рухальным апараце. Суседзі характарызуюць гаспадара кватэры адмоўна: той, у прыватнасці, злоўжывае спіртным. У выніку ўспышкі лёгкаўзгаральнай вадкасці загарэлася адзенне на знаёмай гаспадара жылля. Яна атрымала тэрмічныя апёкі рук і ног першай-трэцяй ступеняў. У кватэры пашкоджана мэбля і сцены.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Ігуменскі тракт

# ЗАГАДКІ АДНАГО ВЯНЧАННЯ

**Сёлета спаўняецца 590 гадоў, як у Новагародку браў свой чацвёрты шлюб 70-гадовы кароль польскі і найвышэйшы князь літоўскі Ягайла з 17-гадовай князёўнай Соф'яй Гальшанскай.**



Часам гісторыкі любяць звяртацца не толькі да невядомых фактаў, каб выказаць свой пункт погляду, а нават да ўжо вядомых. Датычыць гэта і гістарычных дат. У абсалютнай большасці публікацый пра Ягайлу годам яго нараджэння называецца 1351 альбо 1352. Гэта засведчылі як нашыя, так і замежныя даследчыкі. Аднак апошнім часам у польскай навуковай літаратуры сустракаецца іншая дата, і звязана гэта акурат са шлюбаваннем караля польскага ў Новагародку. Гаворыцца, праўда, без спасылак на адпаведныя дакументы, што 60-гадовы, а не 70-гадовы Ягайла браў шлюб з Соф'яй Гальшанскай. Ну, ды хай сабе: мо ў спрэчцы і сапраўды нарадзіцца ісціна.

Штосьці падобнае і з датай шлюбавання. У гістарычных крыніцах называюцца дзве: 4 і 24 лютага 1422 года. Паколькі большасць сведчанняў за 24 лютага, то і я таксама прытрымліваўся гэтай даты, калі пісаў раман «Каралева не здраджвала каралю, альбо Каралеўскае шлюбаванне ў Новагародку». Такім чынам, сёлета спаўняецца 590 гадоў, як гальшанская княжна Соф'я — сярэдняя з трох дочак князя Андрэя Іванавіча Гальшанскага і Аляксандры Дзмітрыеўны з роду Друцкіх — пабралася шлюбам з каралём польскім Ягайлам і неўзабаве стала каралевай польскай, далучылася да грона еўрапейскіх уладных дамоў.

Шлюб гэты адбываўся ў нашым сённяшнім Навагрудку амаль праз 200 гадоў пасля таго, як горад з'яўляўся рэзідэнцыяй вялікага князя літоўскага і першага караля Вялікага Княства Літоўскага Міндоўга. 24 лютага 1422 года ў гэтым ужо не стольным горадзе сабралася столькі высокапасаднага люду з Княства і Каралеўства Польскага, што можна было падумаць: гісторыя робіць кругабег і да Новагародка вяртаецца былая сталічная велічнасць і значнасць. Ведама, такая непраўдападобная вестка агучыла ўсё наваколле — ад Вільні ажно да Кракава: тут задумаў браць свой чацвёрты шлюб сам кароль польскі і найвышэйшы князь літоўскі Ягайла. Гэта ён, калі быў толькі вялікім князем літоўскім і сваёй рэзідэнцыяй меў Крэўскі замак, прымаў у 1385 годзе высокапасадную дэлегацыю з польскай сталіцы. Польская шляхта прыехала ў далёкія землі, каб запрасіць Ягайлу стаць каралём. А каб прэтэндэнт не адмовіўся, прапанавалі 33-гадоваму вялікаму князю за жонку найпрыгажэйшую ў Еўропе 12-гадовую каралеву польскую Ядвігу. Шчаслівы Ягайла пераехаў у Кракаў, стаў жыць у каралеўскім Вавелі і спадзявацца на сына-спадчынніка, каб можна было законным чынам перадаць уладу.

Ды не спрыяў Ягайлу лёс. Ядвіга нарадзіла дачку, якая не пражыла і месяца, а адразу за ёй памерла і сама 25-гадовая Ядвіга. Аўдавелы кароль яшчэ двойчы намагаўся выпрабаваць лёс. 29 студзеня 1402 года ён пабраўся шлюбам з 21-гадовай нямкіняй Ганнай Цылейскай — дачкой графа Цыліі Вільгельма. Ганна нарадзіла яму дачку, якую назвалі Ядвігай. Але па спадчынным праве каралём мог стаць толькі сын, а не дачка. А 21 сакавіка 1416 года другая Ягайлава жонка адышла ў лепшы свет. Мінула каля года, і кароль мусіў жаніцца трэці раз. На гэты раз ён выбраў «простую польку» — удаву пасля двух мужоў Эльжбету Граноўскую-Пілецкую. Яна мела дзяцей ад ранейшых шлюбаў. Аднак ад шлюбу з Ягайлам дзетак не было. І зноў злы лёс не пашкадаваў Ягайлу. Праз тры гады сумеснага жыцця Эльжбеты не стала. На вачах усіх падданых знікала мара Ягайлы мець спадчыннікаў, каб не выпусціць каралеўскі жэзл у чужыя рукі.

Аднак не такі быў крэўскі выхаванец, каб складваць рукі і паддавацца лёсу. Ён задумаў ажаніцца чацвёрты раз. Ды не проста ўзяць чарговы шлюб, а зрабіць так, каб і лёс падпарадкаваць сабе, і ўсім даказаць, што вялікалітоўскія гаспадары могуць быць здатнымі ва ўсіх справах. І сямідзесяцігадовы Ягайла папрасіў свайго паплечніка, вялікага князя літоўскага Вітаўта пасватаць яму сямнаццацігадовую гальшанскую князёўну Соф'ю, якая тады жыла ў свайго дзядзькі Сямёна Дзмітрыевіча Друцкага, бо яе бацька памёр, калі Соф'і было ўсяго 5 гадкоў. Аднак на той час вельмі пільна сачылі за захаваннем звычаяў і традыцый. Меншая сястра не магла пайсці замуж раней за старэйшую. А старэйшую Васілісу не хацеў браць Ягайла. Каб задаволіць каралеўскі капрыз, давялося хуценька знайсці жаніха Васілісе.

Але і гэта не ўсе з прыдумак Ягайлы. Выбіраючы жонку са сваіх ліцвінскіх, то бок беларускіх зямель, ён спадзяваўся, што яна адвядзе караля ад бяздзетнасці. А каб гэты спадзеў стаў мацнейшым і больш надзейным, Ягайла вырашыў пабрацца шлюбам не ў стольным польскім Кракаве, а ў былой сталіцы Вялікага Княства Літоўскага, якая і яго самога выправіла ў каралеўскую дарогу, надзейна паставіла на крыло.

Вось і прыехаў ён з вялікай світай у заснежаны Новагародак, каб тут, на сваёй ліцвінскай, лічы, беларускай, зямлі пабрацца шлюбам з дачкой гальшанскага князя Андрэя, таксама ліцвінкай. Пра тую памятную падзею дагэтуль усім наведнікам Навагрудка нагадвае памятная дошка ў Фарным касцёле, калісьці збудаваным Вітаўтам Вялікім, пастаўленая ў 1920-я гады (на польскай мове): «У гэтай святыні ў 1422 годзе Уладзіслаў Ягайла, кароль польскі і вялікі князь літоўскі, браў шлюб з Соф'яй, княжной гальшанскай, будучай маткай каралёў польскіх Уладзіслава Варненьчыка і Казіміра Ягелончыка. Кароль Казімір Ягелончык быў бацькам св. Казіміра і каралёў польскіх Яна Ольбрахта, Аляксандра, Жыгімонта І, а таксама Уладзіслава, караля венгерскага і чэшскага, і Фрыдэрыка, кардынала касцёла рымскага, прымаса Польшчы, дзедам Жыгімонта Аўгуста, апошняга з дынастыі Ягелонаў, якія на вышэйшую ступень магутнасці і славы ўзнеслі Каралеўства Польскае і Вялікае Княства Літоўскае».

Так гальшанская князёўна Соф'я стала не толькі каралевай польскай, але і маці каралёў, як называлі яе сучаснікі і пісьменнікі. Хіба ж не праўда? Зірніце яшчэ раз на пералік імёнаў і прозвішчаў, што на навагрудскай памятнай дошцы. Бачыце, колькі там розназямельных каралёў? І ўсе — ад Ягайлы і Соф'і Гальшанскай, выхаванцаў нашай, тутэйшай зямлі. Кажуць, што і дагэтуль у Еўропе няма ніводнага высокаўладнага дома, які ў сваёй спадчыннай гісторыі не меў бы Ягайлавых і Соф'іных каранёў.

Вось так шырока разгарнулася адна з магутных еўрапейскіх дынастый пасля ўдалага шлюбавання ў Новагародку. Каралеўская (польская, венгерская і чэшская) дынастыя Ягелонаў-Ягайлавічаў, адгалінаванне Гедымінавічаў панавала ў сярэднявечнай Еўропе з 1377 да 1572 года. Новагародскае шлюбаванне амаль два стагоддзі ўплывала на ход еўрапейскай палітыкі.

Хоць, што праўда, і з Соф'яй Гальшанскай у Ягайлы жыццё не было бясхмарным. Пасля нараджэння першынца Уладзіслава яе абвінавацілі ў здрадзе мужу, схапілі рыцараў, якія нібыта часцей за іншых наведвалі ложніцу (спальню) каралевы. Катавалі, дапытвалі. Ды адзін з іх — вось дзе сапраўднае рыцарства! — Генрык з Рогава і пад прымусам не мог паклёпнічаць. Ён цвёрда стаяў на сваім: «Каралева не здраджвала каралю!» І даказаў, і апраўдалі Соф'ю. І нарадзіла яна яшчэ двух сыноў, адзін з якіх неўзабаве памёр, а трэці Казімір (які называўся таксама Андрэем — у гонар свайго дзеда і Соф'інага бацькі Андрэя Гальшанскага) меў 13 дзяцей.

Вось такое яно — новагародскае шлюбаванне Ягайлы і Соф'і Гальшанскай.

Але чаму менавіта ў Новагародку, які з 1415 года быў рэзідэнцыяй праваслаўнага мітрапаліта Вялікага Княства Літоўскага, шлюбаваўся ў 1422 годзе католік кароль польскі, калі ўсе ранейшыя ягоныя шлюбы адбываліся ў Кракаве? Чаму трэба было незлічонай колькасці гасцей, вяльмож і дваровых людзей ехаць за блізкі свет — у нейкі недасяжны Новагародак, калі ўсе зручнасці і шляхецкі шык панавалі ў Кракаўскім Вавелі? Чаму наогул кароль выбраў нікому не вядомую Соф'ю з Гальшан, якую пасля ганарлівая польская шляхтаназаве трохі здзекліва Сонкай?

Усе гэтыя пытанні хвалявалі мяне, калі задумваўся я пра нашу даўнюю агульную гісторыю, калі карцела нешта напісаць пра той далёкі, але вызначальны для нашай зямлі час. Пошук адказаў і прывёў да стварэння рамана «Каралева не здраджвала каралю, або Каралеўскае шлюбаванне ў Новагародку», першая частка якога — мастацкі твор, а другая — персаналіі, гарады, краіны, шмат у чым новая, «ачалавечаная», храналогія таго часу і тых падзей, якую я назваў «Ягайлаў часапіс».

Калі ж і вас зацікавілі ўсе гэтыя і шмат якія іншыя «чаму?», тады запрашаю да агульнага роздуму над нашай далёкай, але не прыцьмелай гісторыяй: будзем разам шукаць адказы.

**Анатоль БУТЭВІЧ.**

■ Ліставанне

**ЗВЫКЛАЯ справа: чытачы пішуць у рэдакцыю (пытаюцца, скардзяцца, просяць дапамогі, дзеляцца думкамі, вершамі, байкамі), мы — пішам ім. Як правіла, асабіста. Кшталту: «Добрых дзён Вам, шаноўны (альбо шаноўная)...». Аднак бываюць выключэнні — бываюць пытанні, якія — дакладна ведаеш — хвалююць не толькі таго, хто піша. Таму адказы на іх — праз газету і ў звычным парадку: ліст у рэдакцыю, ліст з рэдакцыі.**
**Такім чынам...**

## Слова ёсць і будзе!

*Наша сям'я цягам некалькіх гадоў пастаянна чытае «Звязду». Аднак мае пытанне наконт назвы. У беларускай мове няма слова звязда. Ёсць зорка. Значыць, і газета павінна называцца так. Ці мы памыляемся? Спадзяёмся атрымаць адказ.*

**Эдуард ЖОЛУД,** *г. Мінск*

На гэтае пытанне мы адказвалі не раз. Але ж калі ёсць патрэба, то разам з новымі падпісчыкамі, разам з тымі, хто прапусціў гэтую інфармацыю, пагартаем «Беларускую энцыклапедыю» (Мінск, 1998 г., т. 7). Паводле яе, «Звязда» — гэта, папершае, штодзённая грамадска-палітычная газета, якая выходзіць з 1917-га года... А па другое — атрыбут калядных абраднасці, рухомая шматпрамянёвая асветленая знутры зорка на кіі, з якой хадзілі так званыя звездары...

Далей у энцыклапедыі ідзе досыць падрабязны расказ пра тое, з чаго і як гэты атрыбут рабіўся, чым упрыгожваўся, а таксама фатаграфія хлопчыка (здымак зроблены ў 40-я гады) з вёскі Капылы Камянецкага раёна з гатовым вырабам.

Звычай жа нашэння звязды, як паведамляецца ў артыкуле, быў пашыраны да 20-30-х гадоў. Само сабой — мінулага стагоддзя.

Але і ў гэтым, дваццаць першым, падчас Каляд звёзды, як сімвал сонца, па-ранейшаму «запальваюцца» — нават у Мінску! Ахвотныя пераапранаюцца ў «мядзведзя«, «казу» і «журава«, ходзяць па кватэрах і офісах — віншуюць гаспадароў і сваіх дзелавых партнёраў, спяваюць жартоўныя песні, частуюцца, варожаць, як продкі, гуляюць у «Яшчара» і «Жаніцьбу Цярэшкі»...

Усё гэта не так часта цяпер? На жаль... Але ж ёсць і, спадзяёмся, будзе, калі мы захаваем памяць, калі мы самі, па магчымасці, будзем адраджаць традыцыю. А следам — і слова звязда.

Яно, як пераканаліся, мове нашых продкаў было. Яно ёсць. І, хочацца верыць, будзе!

## Кожны выбірае па сабе...

*Дзясяткі разоў дасылаў вам карткі на розыгрыш прызоў, спадзяваўся на выйгрыш. І ўсё марна. Таму я вырашыў: газету яшчэ выпісваць буду, а вось удзельнічаць у так званых розыгрышах — ужо не. Бо яно ж калі і пашчасціць на нейкую дробязь, дык потым заедзь па яе ў Мінск, забяры... Сабе даражэй атрымаецца.*

**А. П.,** *г. Бабруйск.*

Як сведчыць рэдакцыйная пошта, пастаянна выпісваць газету — яшчэ не значыць яе... чытаць. Прынамсі, на старонках «Звязды» не раз і не два падрабязна распавядалася, як праходзяць розыгрышы, хто (у тым ліку з людзей староннях) прымае ўдзел... Пастаянна паведамлялася, у які дзень гэтае мерапрыемства ладзіцца, каб ахвотныя маглі стаць сведкамі — прыехаць. І яны, трэба сказаць, прыязджалі, нават здалёк.

Пасля розыгрышаў таксама (і зноў жа пастаянна) пішам, што прызы, як правіла, дастаўляем, развозім...

Вядома ж, тым, каму ўсміхнулася ўдача...

Крыўдна, што яна не ўсміхаецца? Напэўна. Але ж чалавек пры гэтым не купляў латарэйных білетаў, не траціў дадатковых грошай (хіба на канверт). Ён выпісвае газету і атрымлівае яе.

А ўжо нешта звыш... Анекдот, як кажуць, у тэму: дзядзька адзін пра ўдачу марыў. І не проста, а кленчыў пад абразамі і прасіў: «Божухна, дапамажы мне выйграць прыз у звяздоўскай латарэі!» Назаўтра зноў: «Божухна, дапамажы мне выйграць...» І на паслязаўтра — тое ж... Збрыдзеў ён Богу! І той азваўся, сказаў: «Мужык. Дык дапамажы ж і ты мне: выпішы хоць адзін раз гэтую газету, дашлі ў рэдакцыю картку...».

Адкуль выснова: у таго, хто выпісвае газету і дасылае картку, шансы на выйгрыш ёсць. У таго, хто не — няма. Кожны выбірае...

## Не адзін Гаўрыла ў Полацку

*У тлумачальным слоўніку беларускай мовы ёсць словы блага, благі. Абодва яны — з негатыўным сэнсам. Разам з тым, благаславенне значыць ухваленне, благаславіць — перахрысціць са словамі малітвы ці, ухваліўшы, накіраваць на што-небудзь. Дзе логіка: гэтыя словы ёсць, а слова дабравесце ў тым самым слоўніку чамусьці няма. Патлумачце.*

**Г. КАЗЛОЎСКІ,** *г. Рагачоў.*

Здалёк...

Нехта — і, мусіць, вельмі разумны! — падлічыў, колькі часу патрабуецца, каб вывучыць замежную мову.

І ці не ён жа прызнаў, што жыцця не хопіць, каб вывучыць сваю! Хоць, здавалася, ёсць для гэтага шмат умоў: і падручнікі, і настаўнікі, і безліч кніг — у тым ліку слоўнікаў. Адзінае не такі вядомы, магчыма, — з рэлігійнымі і багаслоўскімі тэрмінамі царкоўнаславянска-беларускі, укладзены Біблейскай камісіяй Беларускай праваслаўнай царквы...

Дык вось, у прадмове да яго зазначана, што паміж прадстаўнікамі розных канфесій, паміж перакладчыкамі няма пакуль узгодненасці ў выкарыстанні нават самых асноўных паняццяў. Прынамсі, Гасподзь Бог наш яшчэ і Госпад — Госпадзь — Пан — Гаспадар — Усеспадар — Спадар — Уладар — Уладыка; Спас — Спасіцель — Ратаўнік — Збавіцель — Збаўца; Суцяшыцель — Суцешнік — Пацяшыцель...

Тое ж і з нашымі святамі: Раджджаство — яно ж Ражаство — Ражство — Раство — Божае Нараджэнне — Каляды;

Уваскрасенне — Уваскрэсенне — Уваскрэсеньне — Уваскрысеньне — Ускрэсеньне — Згробуўстанне — З мёртвых устаньне — Устанне з мёртвых.

Узнясенне — Узьнясеньне — Увазнясеньне — Унебаўшэсьце.

Благавешчанне — Багавешчанне — Дабравесце — Дабравешчанне — Добрая Вестка — Добрая Навіна — Звеставанне — Зьвеставаньне...

Тады якія ж словы трэба выбіраць, якімі карыстацца?

Хай падкажа гэта ўласнае ўспрыманне, альбо... продкі. Не ведаю, як вашы, а мае, у прыватнасці, казалі Гасподзь, Бог, святкавалі Каляды (не Ражство і не Раджджаство), Вялікдзень (не Пасху), Звеставаньне (і Дабравесце таксама!), Ушэсце.

Тое ж святкуюць нашчадкі.

## «Ганарымся мы сабой...»

*У нашу хату «Звязда» прыходзіць 65 гадоў. Чытаем з ахвотай! Помнім той цудоўны час, калі разам з газетай збіралі «жывы фальклор«, пісалі свае творы ў «Агульны сшытак«, «сыходзіліся» «на прызбу да Алены»... Увесь гэты матэрыял я захоўваю. Часам перачытваю, успамінаю. Цяпер вельмі падабаецца рубрыка «Алё, народ на провадзе!». Пісала ў яе і сама, нават друкавалася. І зараз, з удзячнасці, хачу павіншаваць «Звязду» з блізкім ужо 95-годдзем. Да яго я склала наступныя прыпеўкі:*

*Ганарымся мы сабой,*
*Што падпіску маем:*
*Кожны дзень усёй сям'ёй*
*Мы «Звязду» чытаем!*
*Дзевяноста яшчэ й пяць*
*Нашай юбілярачцы,*
*Грэх яе не віншаваць*
*Не падняць па чарачцы.*
*Пажадаем для «Звязды«*
*Мы дарогі роўнай!*
*І выходзіць заўсягды*
***Беларуска**моўнай!*

**Л.ФАРБОТКА,** *в. Пруды Стаўбцоўскага раёна.*

У адказ на гэты ліст просяцца хіба словы падзякі, шаноўнай Лідзіі Сямёнаўне. І... абвесткі: да 95-годдзя газеты застаецца менш як два месяцы — «Звязда» прымае віншаванні! Пішыце!

**Валянціна ДОЎНАР, рэдактар аддзела пісьмаў** ■

## ЗАМЕСТ ПРАФІЛАКТЫКІ — РАТАВАЦЬ ЛЮДЗЕЙ

**Ранкам інспектар інспекцыі дзяржаўнага пажарнага нагляду Шчучынскага райаддзела па надзвычайных сітуацыях Дзмітрый Скорб праводзіў пажарна-прафілактычную работу ў жылым сектары. Праязджаючы па вуліцы Леніна, ён заўважыў, што з-пад дзвярэй дома №13 прасочваецца дым...**

Веранда аказалася адчыненай. Дзмітрый забег у памяшканне і ў дыме пачаў шукаць людзей. У адным з пакояў знайшоў нецвярозых мужчын. Адзін драмаў у фатэлі, другі — ляжаў на ложку побач з коўдрай, якая тлела. Абодва нават не рэагавалі на з'едлівую смугу. Эвакуяваць людзей на вуліцу інспектару дапамог мінак, паведамілі ў Міністэрстве па надзвычайных сітуацыях. Дзмітрый ліквідаваў узгаранне, заліўшы яго вадой з вядра. Пакуль інспектар тушыў тлеючы ложак, адзін з пагарэльцаў... уцёк. Гаспадар жа ад медыцынскай дапамогі адмовіўся. Па словах суседзяў, апошні — аматар выпіць. Пажар здарыўся з-за непатушанай цыгарэты.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## У АЎТАПАРКУ ЗАГАРЭЛІСЯ АЎТОБУСЫ...

**У 3 гадзіны ночы ад старшага майстра Гродзенскага аўтобуснага парка паступіла інфармацыя, што гарацць чатыры аўтобусы. Туды накіраваліся 6 пажарных разлікаў.**

Паведамленне паступіла з вялікім спазненнем — МАЗы 2010 года выпуску гарэлі адкрытым полымем, паведамляе прэс-служба Гродзенскага абласнога ўпраўлення МНС. Выратавальнікам спатрэбілася менш за 20 хвілін, каб ліквідаваць узгаранне. Агонь пашкодзіў кузавы і знішчыў салоны транспартных сродкаў. Яны належаць прыватнаму прадпрыемству і выкарыстоўваліся як рэйсавыя аўтобусы для перавозкі пасажыраў у абласным цэнтры. На месцы здарэння працуе следчая група. Найбольш верагодная версія прычыны пажару — парушэнне правілаў эксплуатацыі электрасетак і электраабсталявання (кароткае замыканне электраправодкі).

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Начальнік упраўлення Следчага камітэта па Віцебскай вобласці Уладзімір ШАЛУХІН:

# «ПАСЛЯДОЎНІКАЎ АСТАПА БЭНДЭРА ЯШЧЭ ХАПАЕ...»

**Сёлета ў краіне пачаў функцыянаваць Следчы камітэт. Як дзейнічае новая праваахоўная структура ў паўночнай вобласці? Пра гэта спецыяльнаму карэспандэнту «Звязды» расказаў начальнік упраўлення Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь па Віцебскай вобласці, падпалкоўнік юстыцыі Уладзімір ШАЛУХІН.**



— Мы ўзялі на сябе асноўную нагрузку па расследаванні крымінальных спраў. Заведзена ўжо больш за 7,1 тысячы крымінальных спраў. Разам з тым прынята больш за 1,2 тысячы пастаноў аб адмове ў завядзенні крымінальных спраў. Калі гаварыць пра станоўчыя моманты, можна адзначыць узмацненне ролі саміх следчых у ацэнцы якасці сваёй работы. Створаны так званы працэсуальны кантроль, які дазволіў без удзелу іншых структур непасрэдна ў ходзе расследавання знаходзіць «брак» у следчай рабоце. Станоўчым момантам лічу і адмову ад абвінаваўчага ўхілу...

Зараз яшчэ ідзе працэс фарміравання нашага ўзаемадзеяння з іншымі праваахоўнымі органамі. Пры гэтым мы актыўна адстойваем пазіцыю незалежнасці ад нейкіх думак, падпарадкавання толькі закону пры расследаванні крымінальнай справы — асабліва па справах карупцыйнай і эканамічнай накіраванасці. І ўвогуле, пасля таго, як следчыя з пачатку года пачалі займацца выключна следчай работай, ужо нельга апраўдваць сваю недасведчанасць тым, што «выконваў іншыя функцыі, не звязаныя з расследаваннем». Мы праводзім актыўную работу па навучанні следчых. Для гэтага распрацавалі метадычныя рэкамендацыі, правялі семінары — у прыватнасці, па тэме расследавання крымінальных спраў у пытанні транспартнай бяспекі.

***— Што ж гэта за наваўвядзенне — расследаванне ў парадку паскоранай вытворчасці?***

— З пачатку года змянілася адпаведнае заканадаўства, якое дазваляе праводзіць следства ў парадку паскоранай вытворчасці — максімальна на працягу 15 дзён. Гэтая норма дзейнічае па няцяжкіх злачынствах, якія не ўяўляюць вялікай грамадскай небяспекі. Сёння 16% крымінальных спраў расследаваны такім чынам. Гэта сведчыць пра добрую аператыўнасць следства.

***— Наколькі аператыўна расследуюцца крымінальныя справы?***

— 75 працэнтаў крымінальных спраў расследуюцца ў адведзены законам час — на працягу двух месяцаў. Астатнія патрабуюць больш працяглага расследавання ў сувязі са складанасцю. Самае важнае, каб справа расследавалася якасна. А якасць нашай работы ў першую чаргу ацэньваецца абгрунтаванасцю прыцягнення да крымінальнай адказнасці. Пры гэтым вельмі важна, каб расследаваная справа не была накіравана пракурорам на дадатковае расследаванне. Апошняе — брак у рабоце следчага.

***— Ці шмат за першыя месяцы работы было заведзена карупцыйных і эканамічных крымінальных спраў?***

— Зарэгістравана 265 злачынстваў, у тым ліку 106 — карупцыйнай накіраванасці. Сёлета стала менш крадзяжоў праз злоўжыванне службовымі паўнамоцтвамі. У той жа час павялічылася колькасць тых, хто папаўся на хабарніцтве. Бадай, самыя «гучныя» — справы, звязаныя з аршанскім мясакамбінатам. Тры крымінальныя справы заведзены ў дачыненні да адказных работнікаў гэтага прадпрыемства. Адна з іх — у дачыненні да былога намесніка генеральнага дырэктара. Ён, перавышаючы свае службовыя паўнамоцтвы, заключаў дагаворы і даваў указанні адгружаць прадукцыю расійскім суб'ектам гаспадарання, якія за яе не расплаціліся. У выніку толькі па папярэдняй ацэнцы страта прадпрыемству нанесена ў памеры 8,4 мільярда беларускіх рублёў. А былы генеральны дырэктар аршанскага мясакамбіната падазраецца ў тым, што рабочыя ў службовы і асабісты час працавалі ў яго на дачы, дзе ў ліку іншага манціравалі пірс, надводны гараж, рабілі электраасвятленне. Месцазнаходжанне гэтага кіраўніка зараз устанаўліваецца, яго статус — падазраваны.

Ёсць выпадкі, калі крымінальныя справы аб карупцыі былі спынены, бо ўстаноўлена не ўласная карысная зацікаўленасць, а абгрунтаваная эканамічная рызыка — напрыклад, у экспартнай і іншай дзейнасці.

***— У маі мінулага года, дарэчы, на тым жа прадпрыемстве адбыўся пажар на механічным участку, у выніку чаго загінулі 4 чалавекі. Як расследуецца гэтая крымінальная справа?***

— Зварачныя работы, якія сталі прычынай пажару, праводзіліся з вялікімі парушэннямі правілаў пажарнай бяспекі. Зараз крымінальная справа, заведзеная ў дачыненні да майстра ўчастка па факце парушэнняў правілаў аховы працы, перададзена ў суд Оршы. Таксама расследуецца крымінальная справа, заведзеная ў дачыненні да галоўнага бухгалтара, звязаная з фальсіфікацыяй прычыненай страты — яе мінімізацыяй. Абвінавачанне яшчэ не прад'яўлена.

***— Пракурор вобласці нядаўна выразіў заклапочанасць фактамі праяўлення экстрэмізму і тэрарызму. Вы згодны з тым, што гэта пытанне па-ранейшаму вельмі актуальнае? Тым больш што «аўтары» тэрарыстычнага акта ў мінскім метро жылі ў Віцебску.***

— Пытанне своечасова было разгледжана на каардынацыйным пасяджэнні. Адназначна, сёння мае месца незаконны абарот агнястрэльнай зброі і выбуховых рэчываў. Міліцыяй рэгулярна праводзіцца аперацыя «Арсенал» па добраахвотнай здачы зброі. У наш час інфармацыя аб выбуховых рэчывах даступная ў інтэрнэце. Як паказалі праверкі, на жаль, няма яшчэ і добра наладжанай абароны стратэгічных аб'ектаў: водазабораў, прадпрыемстваў хімічнай прамысловасці і гэтак далей, тэрарыстычны акт у дачыненні да якіх можа скончыцца тэхнагеннай катастрофай.

***— Тэрарыстычны акт у Мінску хутка раскрылі дзякуючы, у ліку іншага, відэазапісу з камер назірання. Ці дастаткова такіх камер у Віцебску?***

— У апошні час пастаянна падымаў пытанне, каб цэнтр Віцебска быў цалкам забяспечаны камерамі назірання. Цана пытання невялікая. Але, на жаль, камеры ёсць толькі на плошчах і некаторых цэнтральных вуліцах. Пры гэтым многія гандлёвыя аб'екты, у тым ліку і буйныя, не забяспечаны цэнтралізаванай сістэмай відэаназірання. І гэта таксама можа спрыяць праяўленню экстрэмісцкіх і тэрарыстычных дзеянняў... Апошні тэракт у Днепрапятроўску паказаў, што сістэма назірання дазваляе хутка ўстанавіць карціну падзей і падазроных.

Сама наяўнасць такой сістэмы аказвае вялікае стрымальнае ўздзеянне на злачынцаў. У Віцебску, у прыватнасці, з пачаткам аснашчэння вуліц камерамі рэзка зменшылася колькасць хуліганскіх праяў.

***— Рэзанансная стала трагедыя ў Полацкім раёне, калі маці забіла немаўля. Які тэрмін пазбаўлення волі ёй пагражае?***

— Расследаванне скончана. Падчас судова-псіхіятрычнай экспертызы было высветлена, што жанчына дзейнічала ў стане рэзкага абвастрэння псіхічнага захворвання. Прызнана неабходным праходжанне ёю лячэння ў псіхіятрычнай бальніцы ва ўмовах узмоцненага назірання. Справа перададзена ў Віцебскі абласны суд, які ўстановіць ёй тэрмін лячэння.

***— Ці былі сёлета заказныя забойствы?***

— Такіх фактаў, як і фактаў наймання прафесійных кілераў, у рэгіёне не зарэгістравана.

***— Ці можаце прывесці прыклад дзейнасці «нашчадкаў» Астапа Бэндэра — у сэнсе стварэння аналагаў прадпрыемства «Рогі і капыты»?***

— Два жыхары Віцебска ў 2008 годзе стварылі прадпрыемства, якое ніякай гаспадарчай дзейнасці не ажыццяўляла. Ведаючы, што на заводах вобласці ёсць лішкі бітуму, якія ўтварыліся пры ажыццяўленні асфальта-бетонных работ, і дамовіўшыся з адказнымі асобамі дарожна-будаўнічага трэста і дарожна-рамонтнага будаўнічага ўпраўлення, яны скралі бітум агульным коштам больш за 35 мільёнаў рублёў. Дарэчы, па гэтай крымінальнай справе страты ўжо кампенсаваныя. Усяго да крымінальнай адказнасці прыцягнуты 11 чалавек. Большасць з іх поўнасцю раскаяліся і звярнуліся да кіраўніка дзяржавы з просьбай аб памілаванні. Праўда, некаторыя спрабавалі ўцячы ад следства — аднаго з арганізатараў злачыннай схемы адшукалі ў Маскве. Вырашаецца пытанне аб перадачы яго праваахоўным органам Беларусі.

***— Ці шмат грамадзян звярталіся ва ўпраўленне са скаргамі на дзеянні следчых?***

— Такіх зваротаў было 65. (Усяго ж ва ўпраўленне Следчага камітэта і яго тэрытарыяльныя падраздзяленні звярнулася каля 350 грамадзян.) У асноўным звароты датычыліся расследавання крымінальных спраў, прынятых рашэнняў. Скардзяцца і на прыгаворы, і на рашэнні суда, але іх можа адмяніць толькі вышэйшы суд.

Каля 160 зваротаў было накіравана ў іншыя органы ў адпаведнасці з кампетэнцыяй. На асабісты прыём да кіраўнікоў упраўлення звярнуліся 40 грамадзян. Жыхар Наваполацка звярнуўся ў гарадскі аддзел Следчага камітэта з просьбай завесці крымінальную справу ў дачыненні да земляка, які завалодаў яго 16 тысячамі долараў. Заяўнік быў прызнаны пацярпелым. Крымінальная справа аднаўлена, і па ёй праводзіцца расследаванне.

На жаль, нашы людзі блытаюць невяртанне даўгоў з махлярствам. Яны даюць грошы, каб атрымаць назад трохі больш. Калі ж ім даўгі не вяртаюць, звяртаюцца ў праваахоўныя органы з патрабаваннем пасадзіць даўжнікоў. Але крымінальнай адказнасці за невяртанне доўгу ў нас няма, а ёсць толькі за махлярства, што прадугледжвае падман і нежаданне вяртаць грошы. Апошняе трэба даказаць. Таму хочацца нагадаць чытачам, каб добра падумалі перад тым, як даць грошы ў доўг. Колькі прыкладаў таго, што ў даверлівых просяць «на бізнэс»... Ёсць прыклады і спыненых крымінальных спраў, і таго, як тых, хто браў у доўг, апраўдвалі. Нават калі факты махлярства цалкам даказаны, няма стапрацэнтнай гарантыі вяртання страты.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## П'ЯНЫ І АГРЭСІЎНЫ

**кіроўца здзейсніў аварыю на вуліцы Суворава ў Брэсце.**

28-гадовы гараджанін на аўтамабілі «Мазда» выехаў на паласу сустрэчнага руху, у выніку чаго адбылося лабавое сутыкненне з машынай «Нісан». За рулём апошняй сядзела жанчына, у яе салоне знаходзіліся дзеці. Жанчына з цялеснымі пашкоджаннямі дастаўлена ў бальніцу, дзеці фізічна не пацярпелі. А віноўніка ДТЗ прыйшлося затрымліваць з дапамогай спецсродкаў, бо малады чалавек адразу накінуўся на інспектара ДАІ і стаў наносіць яму ўдары. Калі агрэсіўнага кіроўцу нейтралізавалі і даставілі ў медустанову, прыборы паказалі ў яго крыві 2,2 праміле алкаголю.

**Яна СВЕТАВА.**


## Минский районный исполнительный комитет 13 июля 2012 г. проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь в Минском районе

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь земельного участка | Целевое назначение | Инженерная инфраструктура * | Расходы по подготовке документации (рублей) | Начальная цена земельного участка (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Крупицкий с/с, д. Каралино, участок № 3 | 623683905601000124 | 0,1513 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 40 000 000 | 8 000 000 |
| 2 | Крупицкий с/с, д. Пятевщина | 623683908101000327 | 0,1682 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ | 84 000 | 70 000 000 | 14 000 000 |
| 3 | Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи | 623655500001000707 | 0,1100 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 4 653 510 | 124 000 000 | 24 800 000 |
| 4 | Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи, массив № 3, участок № 1 | 623655500001000419 | 0,2304 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 82 000 000 | 16 400 000 |
| 5 | Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи, массив № 3, участок № 2 | 623655500001000441 | 0,1925 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 70 000 000 | 14 000 000 |
| 6 | Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи, массив № 3, участок № 20 | 623655500001000542 | 0,1575 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 56 000 000 | 11 200 000 |
| 7 | Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи, массив № 3, участок № 21 | 623655500001000426 | 0,1575 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 56 000 000 | 11 200 000 |
| 8 | Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи, массив № 3, участок № 22 | 623655500001000415 | 0,1575 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 56 000 000 | 11 200 000 |
| 9 | Мачулищанский п/с, г.п. Мачулищи, массив № 3, участок № 49 | 623655500001000481 | 0,1476 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 53 000 000 | 10 600 000 |
| 10 | Мачулищанский п/с, д. Мачулищи, участок № 1 | 623675202001000278 | 0,1000 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 3 440 650 | 72 000 000 | 14 400 000 |
| 11 | Мачулищанский п/с, д. Мачулищи, участок № 2 | 623675202001000279 | 0,1229 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество, газ, водопровод | 3 405 230 | 88 000 000 | 17 600 000 |
| 12 | Папернянский с/с, д. Лапоровичи, участок № 39 | 623685505101000339 | 0,1608 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 1 539 843 | 182 000 000 | 36 400 000 |
| 13 | Папернянский с/с, д. Лесины, участок № 1 | 623685506101000062 | 0,1421 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 2 540 736 | 50 000 000 | 10 000 000 |
| 14 | Папернянский с/с, д. Лесины, участок № 2 | 623685506101000060 | 0,1200 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 2 540 736 | 46 000 000 | 9 200 000 |
| 15 | Папернянский с/с, д. Лесины, участок № 3 | 623685506101000061 | 0,1436 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 2 816 199 | 50 000 000 | 10 000 000 |
| 16 | Сеницкий с/с, аг. Атолино, участок № 214 | 623686600601000285 | 0,1520 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 70 000 | 51 000 000 | 10 200 000 |
| 17 | Сеницкий с/с, д. Щитомиричи, участок № 78 | 623686607101000283 | 0,1422 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 105 000 | 68 000 000 | 13 600 000 |
| 18 | Сеницкий с/с, д. Щитомиричи, участок № 157 | 623686607101000377 | 0,1418 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | - | 84 000 | 68 000 000 | 13 600 000 |
| 19 | Хатежинский с/с, д. Птичь, ул. Садовая | 623687506101000360 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 3 182 155 | 60 000 000 | 12 000 000 |
| 20 | Хатежинский с/с, д. Птичь, ул. Садовая | 623687506101000361 | 0,1500 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 3 182 155 | 60 000 000 | 12 000 000 |
| 21 | Хатежинский с/с, д. Птичь, ул. Садовая | 623687506101000362 | 0,1234 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 3 366 200 | 60 000 000 | 12 000 000 |
| 22 | Хатежинский с/с, д. Птичь, ул. Садовая | 623687506101000363 | 0,1234 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 3 366 200 | 60 000 000 | 12 000 000 |
| 23 | Хатежинский с/с, д. Птичь, ул. Садовая | 623687506101000364 | 0,1497 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 3 366 200 | 60 000 000 | 12 000 000 |
| 24 | Хатежинский с/с, д. Птичь, ул. Садовая | 623687506101000365 | 0,1497 га | Для строительства и обслуживания жилого дома | электричество | 3 366 200 | 60 000 000 | 12 000 000 |

Аукцион состоится по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8. Дата проведения: **13.07.2012 г. в 10.00.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 8, к. 416. Окончание приема заявлений и документов: **09.07.2012 г. в 17.00.** Контактный телефон: 204 11 62.

Задаток за участие в аукционе на Лоты 1–2 перечисляется на расчетный счет № 3641900000091 Крупицкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052399, код платежа – 04901.

На Лоты 3–11 перечисляется на расчетный счет № 3641621080042 Мачулищанского посисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600452694, код платежа – 04901.

На Лоты 12–15 перечисляется на расчетный счет № 3641621120061 Папернянского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600052411, код платежа – 04901.

На Лоты 16–18 перечисляется на расчетный счет № 3641900000134 Сеницкого сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова,2, код 520, УНП 600052409, код платежа – 04901.

На Лоты 19–24 перечисляется на расчетный счет № 3641900000121 Хатежинского сельисполкома, филиал № 614 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Червякова, 2, код 520, УНП 600231359, код платежа – 04901.

К участию в аукционе допускаются физические лица, подавшие в комиссию в указанные сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в объявлении расчетный счет задаток (задатки) в размере, порядке и сроки, определенные в извещении.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Документы, необходимые для участия в аукционе:

1. Заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков.

2. Документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет с отметкой банка.

3. Гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

3.1 представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками в соответствующем сельисполкоме.

Аукцион признается несостоявшимся в случаях, если: ни один из участников аукциона в соответствии с решением комиссии не был признан победителем; заявление об участии в аукционе подано менее чем двумя участниками аукциона (в этом случае земельный участок предоставляется в частную собственность единственному участнику несостоявшегося аукциона, при его согласии, с внесением платы за земельный участок в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов).

Внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, осуществляются в установленном порядке победителем аукциона в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона.

Местный исполнительный комитет не позднее 2 рабочих дней после внесения победителем аукциона платы за предмет аукциона, возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения и выполнения условий, предусмотренных в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает ему выписку из названного решения, а также один экземпляр протокола о результатах аукциона.

* В разделе «инженерная инфраструктура» указаны коммуникации, к которым возможно подключение в указанном населенном пункте.



## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Коралл» (продавец)

**извещает о проведении 18 июля 2012 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование | Адрес объектов | Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб. | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | станок радиально-сверлильный 2М55 (инв. № 21125) | г. Гомель, ул. Лепешинского, 7 | 14 810 400 | 1 400 000 |
| 2 | станок строгальный четырехсторонний деревообрабатывающий (инв. № 205000) | | 9 690 000 | 900 000 |

Продавец: Открытое акционерное общество «Коралл», ул. Лепешинского, 7, 246000, г. Гомель.

Шаг аукциона – 5 % от начальной цены лота.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «Коралл») р/с 3012111889019 в Региональной Дирекции № 300 ОАО «БПС-Сбербанк» по Гомельской области, ул. Крестьянская, 29а. код 369 до 17.00 **по 16 июля 2012 года.**

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения **по 16 июля 2012 года.**

К заявлению прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении (информационном сообщении);

индивидуальным предпринимателем – копия (без нотариального засвидетельствования) свидетельства о государственной регистрации; юридическим лицом – доверенность, выданная представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица; иностранным юридическим лицом, иностранной организацией, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств, иностранным государством и их административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организацией – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией; представителем иностранного инвестора – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности иностранного инвестора, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина Республики Беларусь или индивидуального предпринимателя – доверенность.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане, физические лица (граждане Республики Беларусь и лица без гражданства), постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, представители иностранных инвесторов предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продаются одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by**



## Извещение о проведении 16 июля 2012 года торгов по продаже имущества ОАО «Строймазтрест»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование продаваемого имущества)** | Б 1/к Административное здание (назначение: здание административно-хозяйственное) общей площадью 112 кв.м, инвентарный номер 500/С-12433 |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | г. Минск, ул. Трудовая, д. 1а |
| **Сведения о продавце** | ОАО «Строймазтрест», ул. Трудовая, 1а, комната 24, 220021, г. Минск |
| **Сведения об организаторе торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск |
| **Начальная цена предмета торгов** | 507 000 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 50 000 000 белорусских рублей |
| **Сведения об обременениях** | аренда |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «Строймазтрест», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного поручения о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена фиксируется в протоколе о результатах аукциона и не включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Торги состоятся **16 июля 2012 года в 14.30** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 14.06.2012 по 12.07.2012 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок:**
**(017) 327 48 36 (УП «Минский городской центр недвижимости), (044) 756 57 81 (ОАО «Строймазтрест»).**

